WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЛЮТАГА 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 25
(26633)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ЖКГ: ТАРЫФЫ БЕЗ ЗМЕНАЎ, АПЛАТА — У РОСТ

ТАРЫФЫ на жыллёва-камунальныя паслугі не зменяцца як мінімум да канца ацяпляльнага сезона. Пра гэта падчас сустрэчы з журналістамі паведаміў першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Генадзь ЛЯПУНОЎ.

Што да перспектывы больш аддаленай, то ў міністэрстве пацвярджаюць: пытанне павелічэння тарыфаў сапраўды разглядаецца. Аднак казаць аб канкрэтных лічбах тут заўчасна — шмат чаго будзе залежаць ад шэрагу акалічнасцяў, і ў тым ліку ад кошту энерганосьбітаў. Да слова, заўважыў Генадзь Ляпуноў, у сярэднім па мінулым годзе грамадзяне краіны аплачвалі 28,2 працэнта рэальнага кошту «камуналкі», тады як чакалася, што летась узровень кампенсацыі выдаткаў насельніцтвам выйдзе на адзнаку ў 32 працэнты.

Пакуль больш пэўна іншае: лічбы ў плацёжках беларусаў узрастуць ужо ў найбліжэйшы час. Аднак прычына тут аб'ектыўная. Калі сярэдняя тэмпература снежня склала «мінус» 3,9, то студзеня — «мінус» 11,4 градуса. Адпаведна павялічыцца аплата за ацяпленне — у залежнасці ад тыпу дамоў у сярэднім ад 6 да 18—20 тысяч рублёў.

Пры гэтым, адзначаюць у міністэрстве, ёсць пэўныя шляхі зніжэння аплаты за кватэру. Гаворка аб усталяванні індывідуальных прыбораў уліку, а таксама аб пераходзе да абслугоўвання дамоў на конкурснай аснове. Так, правядзенне такіх конкурсаў у Мінску паказала, што кошт паслуг асобных арганізацый можа адрознівацца прыкладна ў 1,4 раза. З улікам магчымасці выбару расцэнак падобную практыку плануецца распаўсюдзіць і на рэгіёны.

Тым часам, заўважыў Генадзь Ляпуноў, на працягу мінулага года пратэрмінаваная запазычанасць насельніцтва за жыллёва-камунальныя паслугі зменшылася на 20 працэнтаў. У тым ліку гэта стала вынікам жорсткіх мераў. Летась за даўгі было выселена 207 сем'яў, і з іх 69 — без прадастаўлення іншага жылля. Усяго ж у сувязі з даўгамі ў судах разглядалася 74 тысячы спраў.

Разам з тым, паведаміў Генадзь Ляпуноў, даўгі па-ранейшаму «вісяць» больш чым на 6 працэнтах жылых памяшканняў, а агульная сума пратэрмінаванай запазычанасці ў цэлым па краіне перавышае 34 млрд рублёў. У сувязі з гэтым «работа» з нядбайнымі грамадзянамі працягнецца. Што ж да грамадзян, якім плаціць за кватэру цяжка, то першы намеснік міністра нагадаў: для іх існуе сістэма адраснай сацыяльнай дапамогі.

Сяргей ГРЫБ.

ЦЯПЕРАШНЯЯ ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ БУДЗЕ БОЛЬШ АКТЫЎНАЯ ЗА ПАПЯРЭДНЮЮ

Такое меркаванне выказала ўчора журналістам старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына. Яна прымала ўдзел у семінары-нарадзе са старшынямі і сакратарамі тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій, начальнікам аддзелаў арганізацыйна-кадравай і ідэалагічнай работы рай- і гарвыканкамаў Мінскай вобласці.

Старшыня Цэнтрвыбаркама акцэнтавала ўвагу на росце цікавасці палітычных партый да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Так, паводле яе слоў, калі пры ўтварэнні тэрытарыяльных камісій удзельная вага кандыдатаў ад партый была невялікая, то ўжо ў акруговыя выбарчыя камісіі вылучылі сваіх прадстаўнікоў 13 партый — у колькасным выражэнні гэта амаль 500 чалавек.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта **БЕЛТА** аб актыўнасці партый пры фарміраванні ўчастковых выбарчых камісій, яна выказала меркаванне, што цікавасць да ўдзелу не будзе змяншацца. «І гэта дае пэўны пазітыў, ёсць упэўненасць у тым, што выбары не будуць сумнымі, а значыць выбаршчык прыйдзе на выбарчыя ўчасткі», — лічыць Лідзія Ярмошына.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯНУКОВІЧ ПЕРАМАГАЕ І АДПРАЎЛЯЕ ЦІМАШЭНКУ Ў АДСТАЎКУ



Цэнтральная выбарчая камісія Украіны атрымала і апрацавала звесткі з апошніх выбарчых участкаў.

Па выніках падліку 100 % пратаколаў, у другім туры выбараў прэзідэнта Віктар Януковіч набраў 48,95 % галасоў, Юлія Цімашэнка — 45,47 %. Па меркаванні міжнародных назіральнікаў і большасці мясцовых палітыкаў, выбары былі сумленнымі, а іх вынік — легітымным.

Лідар Партыі рэгіёнаў ужо абвясціў сябе прэзідэнтам і заклікаў суперніцу прызнаць паражэнне. Віктар Януковіч заклікаў Юлію Цімашэнку пакінуць пост прэм'ер-міністра краіны і перайсці ў апазіцыю. Януковіч таксама выступіў за стварэнне новай кааліцыі ў Радзе і ўмацаванне адносінаў з Расіяй.

Аднак Юлія Цімашэнка ўжо тры дні адмаўляецца віншаваць апанента, а яе паплечнікі называюць вынікі галасавання падтасаванымі і абяцаюць абскардзіць іх у судах. Тэлезварот да ўкраінскага народа, з якім 9 лютага планавала выступіць прэм'ер-міністр краіны, не адбыўся. Тэлефоны акрэдытацыі ва ўкраінскім кабміне не адказваюць, маўчыць і тэлефон прэс-сакратара Цімашэнкі. Між тым украінскі міністр Пётр Крупко заявіў, што пасяджэнне ўрада перанесена на 11 лютага.

АЛІМПІЙСКІ ФАКЕЛ ДЛЯ АРНІ

Удзельнікі эстафеты алімпійскага агню ў Ванкуверы могуць выкупіць свой факел за 400 канадскіх долараў. І яшчэ за 100 памятную падстаўку, якую трэба было выкупляць за тыдзень да мерапрыемства. Эстафета алімпійскага агню завершыцца ў дзень адкрыцця Алімпіяды ў Ванкуверы, 12 лютага. Сярод іншых у ёй возьме ўдзел губернатар Каліфорніі, вядомы акцёр Арнольд Шварцэнэгер.

МАЙКЛ ДЖЭКСАН БЫЎ АТРУЧАНЫ?

Справаздача аб праведзеным анатаміраванні цела караля поп-музыкі Майкла Джэксана апублікаваная ў ЗША. У ёй гаворыцца, што смерць зоркі наступіла ў выніку «вострага атручэння прапафолам».

У сувязі з гэтым пракуратура ЗША афіцыйна прад'явіла абвінавачанне асабістаму ўрачу Майкла Джэксана кардыёлагу Конраду Мюрэю ў ненаўмысным забойстве спевака. Раней абвінавачваны заяўляў, што ўводзіў Майклу Джэксану прапафол як сродак ад бяссонніцы. У той жа час, на думку спецыялістаў, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы справаздачы, выпадкі выкарыстання прапафолу ў хатніх умовах звязаны выключна са смяротным зыходам. На практыцы раней не сустракаліся выпадкі прымянення прапафолу для барацьбы з бяссонніцай.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«З ПОЎНЫМІ — ДА ПЕРАМОГІ!»

Віншаванне Прэзідэнта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Лауру Чынчылью Міранду з перамогай на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Коста-Рыка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НЕЛЕГАЛЬНЫ ТРЫКАТАЖ

За эканамічныя і службовыя злачынствы суды горада Баранавічы і Баранавіцкага раёна асудзілі дырэктара ТАА «ТурСвет» і былога начальніка Пінскага міжраённага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Брэсцкай вобласці.

На пачатку мінулага года супрацоўнікі органаў дзяржбяспекі атрымалі інфармацыю аб тым, што адзін з кіраўнікоў прыватнай фірмы Пінска ажыццяўляе незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, звязаную з вытворчасцю і рэалізацыяй трыкатажных вырабаў. У выніку праверак Камітэта дзяржбяспекі і Міністэрства па падатках і зборах было вызначана, што прадпрымальнік адкрыў у жылым доме незарэгістраваную ў вызначаным парадку краму, дзе знаходзілася на рэалізацыі звыш 25 тысяч трыкатажных вырабаў. З іх больш за 20 тысяч не мелі дакументаў, якія пацвярджаюць легальнасць іх набыцця або вырабу.

Для ажыццяўлення незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці бізнэсмен уцягнуў у свае справы начальніка Пінскага МА УДФР КДК па Брэсцкай вобласці, які садзейнічаў спыненню ў дачыненні да ТАА «ТурСвет» праверак праваахоўных і кантралюючых органаў. Крымінальная справа была заведзена па ч. 2 арт. 233 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (ажыццяўленне незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці) і ч. 2 арт. 243 (ухіленне ад выплаты сум падаткаў, збораў). У дачыненні да былога начальніка Пінскага МА УДФР КДК па Брэсцкай вобласці — па ч. 3 арт. 426 (перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў). Абвінавачаных прыгаварылі адпаведна да 4 і 5 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗЛОДЗЕЙ «ЗАКАСІЎ» ПАД РАБОТНІКА МІЛІЦЫІ

Нахабнік ноччу зайшоў у чужое жыллё, а калі гаспадыня прачнулася, назваўся ёй работнікам міліцыі і «выгаварыў» за халатныя адносіны да асабістай бяспекі.

Паводле звестак прэс-афіцэра Партызанскага РУУС Андрэя Сасонкі, 25-гадовы хлопец, які неаднаразова меў канфлікты з законам, вяртаўся дадому з гулянкі каля чатырох гадзін ночы. У пад'ездзе дома ён заўважыў, што дзверы адной з кватэр прыадчыненыя і не пераадолеў «спакусы» зазірнуць у жыллё. У вітальні натыкнуўся на дамскую сумачку і прыхапіў адтуль мабільны тэлефон. Пайшоў далей і... «пазнаёміўся» з гаспадарамі, якія спалі. Жанчына, якая прачнулася, пацікавілася, як няпрошаны візіцёр апынуўся ў кватэры. А той не разгубіўся і «адказыраў»: маўляў, ён працуе ў міліцыі. Яшчэ і заўвагу зрабіў гаспадыні наконт неналежных адносінаў да пытанняў маёмаснай бяспекі. Супрацоўнікі міліцыі затрымалі яго. Між іншым, тэлефон ілжэміліцыянер прадаў у той жа дзень — за дзве бутэлькі гаролкі.

ПАДРОБЛЕНЫЯ ВІЗЫ «ІШЛІ» ПА 2—6 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

Больш за мільён долараў «зарабілі» ўдзельнікі транснацыянальнай злачыннай групы, якія на працягу некалькіх гадоў займаліся арганізацыяй нелегальнай міграцыі жыхароў Афрыкі ў Беларусь, Расію, краіны Еўрасаюза і ЗША. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, супрацоўнікі Галоўнага следчага ўпраўлення папярэдняга расследавання і Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Беларусі спынілі дзейнасць згаданай групы.

У міністэрстве зазначаюць, што злачынцы ажыццяўлялі пошук на Афрыканскім кантыненце ахвотных выехаць у краіны Еўропы і ЗША, выраблялі фальшывыя дакументы візавай падтрымкі, арганізоўвалі адпраўку мігрантаў, іх сустрэчу і размяшчэнне ў нашай краіне, Расіі, ЗША. Для гэтага зламыснікі падраблялі, а таксама кралі незапоўненыя афіцыйныя бланкі візаў і дазволаў на пражыванне многіх краін, якія ўклейваліся ў пашпарты нелегалаў са своечасовым унясеннем у іх несапраўдных анкетных звестак. Кошт фальшывых візаў вагаўся ад 2 тысяч долараў да 6 тысяч. Пры тым саміх мігрантаў ніхто не інфармаваў аб нелегітымнасці дакументаў, што яны атрымлівалі.

Летась у сакавіку ў Мінску з доказамі віны быў затрыманы кіраўнік гэтай крымінальнай структуры Ігрыс Баула, грамадзянін Ганы, у якога было пасведчанне на права жыхарства ў нашай краіне. Беларускія праваахоўнікі праінфармавалі кампетэнтныя органы ЗША і Ганы аб факце яго затрымання, і пачалася сумесная праца праваахоўнікаў па распрацоўцы ўдзельнікаў сеткі, у якую ўваходзілі як жыхары Беларусі, так і Афрыканскага кантынента, ЗША, Заходняй Еўропы і Расіі. У канцы студзеня беларускія праваахоўнікі разам з амерыканскімі калегамі прыбылі ў Акру (сталіцу Ганы), дзе з мясцовымі паліцэйскімі ўстанавілі шэраг новых акалічнасцяў па справе.

500 РУБЛЁЎ ЗА КІЛО СВЕЖЫХ ЯБЛЫКАЎ

Такая гранічная гандлёвая надбаўка вызначана пастановай Мінэканомікі да закупачных (аптовых) цэнаў сельскагаспадарчых ці аптовых арганізацый і імпарцёраў.

Паводле звестак міністэрства, адпаведны дакумент прыняты з мэтай забеспячэння роўнавыгаднасці для гандлёвых арганізацый набыцця і рэалізацыі як айчыннай, так і дарагой імпартнай плодаагароднінай прадукцыі. Пастановай таксама ўдакладнена фармулёўка пазіцыі «соль кухонная харчовая», на якую прымяняюцца абмежаваныя гандлёвыя надбаўкі, шляхам выключэння з гэтай таварнай групы солі марской харчовай, што завозіцца па імпарце і не з'яўляецца прадметам першай неабходнасці, у сувязі з чым пры фарміраванні рознічных цэнаў на яе будуць прымяняцца гандлёвыя надбаўкі, зыходзячы з кан'юнктуры рынку.

Ігар ГРЫШЫН.

СЕРЭНАДА ДЛЯ МАГІЛЁЎСКАЙ КАХАНАЙ

14 лютага пераможца конкурсу «Сапраўднае каханне» атрымае незвычайны прыз ад «Радыё Магілёў». Паводле ўмоў конкурсу, у дзень Святога Валянціна трэба арыгінальным чынам прызнацца ў каханні ў радыёэфіры альбо праз SMS. Вітаюцца любыя формы: напрыклад, на японскай мове, цытатамі з «Яўгена Анегіна», рамансам пад барабанны грукат, карацей — усё, што падкажа каханым фантазія і іх светлае пачуццё. Аўтар лепшага прызнання атрымае рамантычную сустрэчу ў рэстарацыі, а аркестр сыграе серэнаду пад акном каханага чалавека.

Ілона ІВАНОВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ЦУД

Выстава

дае перавагу свабодна ўвайсці і танней набыць

10 лютага на XVII Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы быў VIP-дзень. А ўжо сёння ўсе, хто любіць чытаць і хоча набыць новыя кнігі, могуць задаволіць свае жаданні. Лепшыя кнігі Еўропы і не толькі ў гэтыя дні варта шукаць на вуліцы Янкі Купалы, у выставачным цэнтры «Белэкспа». Прыйсці на выставу можна свабодна, ніякіх табе квіткоў — вось наш беларускі кніжны цуд, нідзе такога няма!

Багацце і разнастайнасць выставы адзначыў **міністр інфармацыі Беларусі Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ**:

— У многіх краінах праводзяцца падобныя форумы. Наш форум, наша выстава, наша сённяшняя сустрэча — мерапрыемства, якое дазваляе зблізіцца і кантактаваць кнігавыдаўцам, а галоўнае, што яна ладзіцца для тых людзей, дзеля якіх уся кнігаіндустрыя працуе, для чытачоў. Сённяшняя выстава незвычайная, асабліва па колькасці ўдзельнікаў — 619 экспанентаў з розных краін свету: гэта Украіна, Расія, Азербайджан, Арменія, Ізраіль, ЗША і шмат іншых краін. І што асабліва цікава сёлета — упершыню ганаровым госцем нашай выставы з'яўляецца Францыя. Гэта сведчыць пра тое, што мы імкнёмся да пашырэння нашай інфармацыйнай прасторы, што няма ніякіх перашкодаў для міжкультурнага і міжнацыянальнага дыялогу, няма межаў і моўных бар'ераў. Сёння ў свеце імкліва развіваюцца інфармацыйныя тэхналогіі, але цікавасць да нашай выставы сведчыць, што кніга жывая. Пяць выставачных дзён дазволяць убачыць шматабсалютна ўсе сучасныя магчымасці, каб папяровую кнігу мог дапоўніць электронны варыянт. Тут ёсць у каго павучыцца. Гэтая выстава карысная як працяг вучэбнага працэсу — вучыцца адзін у аднаго.

Сучасна і з густам... Так, напрыклад, зрабіла свой стэнд Францыя. Грандыёзная жырандоля з відамі Парыжа, нешта накшталт маленькай канферэнц-залы, у якой у той жа дзень сталі шукаць агульную мову з беларускімі наведвальнікамі французскія госці.

Міністр інфармацыі Беларусі Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ, міністр культуры Беларусі Павел ЛАТУШКА і пасол Францыі ў Беларусі Мішэль РЭНЕРЫ (справа налева) на адкрыцці выставы.

Мішэль РЭНЕРЫ, які нядаўна прыехаў у Беларусь у якасці пасла Францыі, адразу апынуўся ў віры актыўнай працы:

— Мне вельмі прыемна, што пачатак маёй працы ў галіне культуры якраз супаў з кніжным салонам. Прыемна, што тут можна знайсці выданні шматлікіх кнігавыдаўцоў і задаволіць любы чытацкі попыт. Да ўсеагульнай радасці першы раз у Беларусі французская літаратура стане даступная шырокай публіцы не толькі на мове арыгінала, але і на рускай і беларускай мовах. Сучасная французская літаратура займае цэнтральнае месца на нашым стэндзе. Акрамя таго, у нас можна будзе ўбачыць альбомы і выданні па ўсіх відах мастацтва, а таксама літаратуру для моладзі. Мы імкнуліся зрабіць так, каб у людзей быў выбар, каб спецыялісты ў галіне французскай літаратуры змаглі сустрэцца з беларускімі чытачамі, спадзяюся, што гэтыя сустрэчы будуць насычанымі. Таму што Мінская міжнародная кніжная выстава з'яўляецца першым культурным мерапрыемствам Францыі і Беларусі пасля падпісання ў Парыжы ў студзені гэтага года пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі, навукі і тэхнікі, СМІ. Падрыхтоўка да гэтай выставы — добры прыклад супрацоўніцтва паміж дзвюма нашымі краінамі.

СТАР. 2

ДЭФІЦЫТУ БУДМАТЭРЫЯЛАЎ ДЛЯ «ІНДЫВІДУАЛАЎ» СЁЛЕТА НЕ БУДЗЕ

Па чутках і аўтарытэтна

Сяргей КУРКАЧ

ПРА гэта журналісту «Звязды» паведаміў начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ. Спецыяліст міністэрства адказаў на самыя актуальныя жыллёвыя пытанні, якія рэдакцыя атрымала ад сваіх чытачоў.

— Няўжо ўсё адменяць? Менавіта такое пытанне ўсё часцей задаюць тыя, хто сваю жыллёвую праблему яшчэ не вырашыў. І сапраўды, калі парламентарыі пачалі актыўна абмяркоўваць ідэю масавага ўкаранення іншых формаў фінансавання жылля, такіх, як іпатэка і будаўнічыя зберажэнні, тады — чакай у хуткім часе скарачэння аб'ёмаў ільготнага крэдытавання. А можа ўвогуле на льготных крэдытах паставяць «крыж»?

— Не. Сёлета прынята пастанова ўрада краіны, дзе прапісаны аб'ём ільготнага крэдытавання ў 1,5 раза большы, чым летась. Будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай будзе толькі павялічвацца.

— Але людзі напалоханыя, што жыллёвую чаргу і льготныя крэдыты могуць адмяніць праз год ці два...

— Хвалявацца няма чаго. Жыллёвую чаргу ліквідуюць далёка не заўтра. Усё залежыць ад таго, як будуць распрацоўвацца і ўкараняцца новыя механізмы фінансавання жылля. Сёлета новых механізмаў (Закона аб жыллёва-будаўнічых зберажэннях) яшчэ не будзе. Закон нашым міністэрствам падрыхтаваны, але парламент не можа яго прыняць, бо ў спецыялістаў няма адзінага меркавання па дзвюх прынцыповых пазіцыях. Першае пытанне датычыцца банкаўскай сістэмы: яна можа быць адкрытай, калі банк акрамя будзберажэнняў займаецца яшчэ ўкладамі і іншай дзейнасцю (сённяшняя падобная сістэма дзейнічае ў Беларусбанку), або закрытай, калі банк займаецца толькі будзберажэннямі. Няма згоды ў спецыялістаў і па пытанні прадастаўлення жыллёвых прэмій удзельнікам сістэмы будзберажэнняў.

— Што гэта за прэміі?

— Нагадаю, што перад атрыманнем жыллёвага крэдыту кліент павінен прайсці накапляльны перыяд. Удзельнік сістэмы ўносіць у банк грошы пад меншы працэнт, чым існуе на звычайных дэпазітах. Каб часткова кампенсаваць яму страту гэтага працэнта і ў якасці ўдзячнасці з боку дзяржавы за «доўгія» грошы (тэрмін накапляльнага перыяду складае мінімум 5—7 гадоў), яму штогод можа даплачвацца своеасаблівы бонус. Памер прэміі павінен зацікавіць удзельнікаў сістэмы, але, з іншага боку, трэба ўлічваць магчымасці дзяржавы. Так, напрыклад, у Германіі максімальны бонус у сістэме будзберажэнняў складае 500 еўра.

— Летась быў прыняты Закон аб іпатэцы, але банкі нават пад заклад маёмасці даюць крэдыты з вялікімі працэнтамі. Як бы гэтыя працэнты знізіць?

— Прымусіць банкі знізіць працэнт па крэдытах нельга. Можна толькі кампенсаваць ім страты, як гэта робіцца па льготных крэдытах. Аднак цяпер у банкаў не хапае «доўгіх» грошай, захоўваецца высокі ўзровень стаўкі рэфінансавання, таму іпатэчны крэдыт мае працэнты на ўзроўні звычайных пазык. Сёння іпатэка слаба цікавіць большасць насельніцтва менавіта па прычыне высокіх працэнтных ставак. Падчас крызісу іпатэчны крэдыт істотна не патаннее. Аднак заўважу, што нават з'яўленне новых механізмаў фінансавання будаўніцтва жылля імгненна «не пахавае» сістэму льготнага крэдытавання.

— Летась на апошняй калегіі вашага міністэрства была ўзнята праблема магчымага дэфіцыту сёлета на ўнутраным будаўнічым рынку цэменту ў памеры каля 600—700 тысяч тон. Хутчэй за ўсё, магчымы дэфіцыт цэменту будзе пакрывацца за кошт імпартных паставак. Тады кіраўніцтва будаўнічай галіны запэўніла, што дзяржпрадпрыемствы атрымаюць цэмент па наяўных квотах, а імпартныя пастаўкі цэменту будуць вымушаны ажыццяўляць прыватныя структуры. Гэта закране і індывідуальных забудоўшчыкаў?

— Пытанне цэменту для індывідуальных забудоўшчыкаў будзе абавязкова вырашацца станоўча. Цяпер запраектаваны цэлыя жылыя пасёлкі для індывідуалаў. Актыўна размяркоўваюцца зямельныя ўчасткі ў гэтых месцах. Упэўнены, што прыватныя забудоўшчыкі будуць забяспечаны асноўнымі будаўнічымі матэрыяламі ў поўным аб'ёме.

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РАЗВЯЗКА «ЭНЕРГЕТЫЧНАЙ» СПРАВЫ НЕДАЛЁКА

Прад'яўляецца канчатковае абвінавачванне групе асобаў, якія сістэматычна ажыццяўлялі крадзеж таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на шэрагу прадпрыемстваў энергетычнай галіны Гомельскай і Магілёўскай абласцей, паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ Беларусі па Гомельскай вобласці.

У чэрвені мінулага года ўпраўленнем КДБ па Гомельскай вобласці ў дачыненні да 17 чалавек была заведзена 21 крымінальная справа па прыкметах складу злачынстваў, прадугледжаных артыкулам Крымінальнага кодэкса Беларусі аб прысвойванні або растраце, учыненых паўторна групай асобаў па папярэдняй змове. Сярод фігурантаў крымінальных спраў — як адказныя асобы прадпрыемстваў, так і тыя, хто дапамагаў ім рэалізоўваць выкрадзенае. Крадзеж таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў ажыццяўляўся шляхам незаконнага іх спісання, а потым рэалізацыі суб'ектам гаспадарання розных формаў уласнасці — як за наяўны разлік, так і шляхам пастаўвак ад імя лжэпрадпрымальніцкіх структур. Атрыманыя грошы размяркоўваліся паміж членамі групы ў адпаведнасці з роляй кожнага. Па звестках следства, толькі з красавіка 2008-га па сакавік 2009 года зламыснікі выкралі і незаконна рэалізавалі таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму больш за 100 мільёнаў рублёў. У ходзе следства падазроныя часткова кампенсавалі страты. На разліковыя рахункі прадпрыемстваў пералічана больш за 50 мільёнаў рублёў. У найбліжэйшы час крымінальныя справы будуць накіраваныя ў суд.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЧАКАЕМ СНЕГ, А НА ПОЎДНІ КРАІНЫ — СНЕГ З ДАЖДЖОМ

У бліжэйшыя суткі, 11 лютага, у цэлым па Беларусі будзе воблачнае з праясненнямі надвор'е, паведамілі ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры.

Прагназуецца невялікі мокры снег, па поўдні краіны магчымы снег з дажджом. Месцамі чакаецца галалёд, на дарогах галалёдзіца. Рэспубліканскі гідраметэацэнтр звяртае асаблівую ўвагу на гэтыя негатыўныя з'явы надвор'я.

Вецер паўднёва-ўсходні ўмераны, днём парывісты. Тэмпература паветра ноччу складзе 5—11 градусаў ніжэй за нуль, па паўночным захадзе пры праясненнях яна панізіцца да мінус 15 градусаў. Днём тэмпература будзе вагацца ад мінус 5 градусаў да плюс 1.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.02.2010 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 898,00
▲1 еўра	3 986,20
1 латвійскі лат	5 624,45
1 літоўскі літ	1 155,41
1 чэшская крона	152,72
1 польскі злоты	979,47
▲1 расійскі рубель	95,81
1 украінская грыўня	359,11

Агенцтва УладзімірГраўцова

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,2462
10 UAH	37,4566
1000 BYR	10,4333
EUR	41,6551

ISSN 1990 - 763X

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «АВТОМАГИСТРАЛЬ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом зданий, сооружений, передаточных устройств и оборудования, расположенных в районе д. Василевщина Березинского района Минской области в составе:

административно-бытовой корпус, об. пл. 376,7 кв.м; склад, об. пл. 631,0 кв.м; котельная, об. пл. 108,5 кв.м; склад, об. пл. 46,0 кв.м; здание разметочных материалов, об. пл. 165,1 кв.м; автовесовая, об. пл. 26 кв.м; пожарный резервуар; канализационно-очистные сооружения; водонапорная башня; артскважина; наружные сети водопровода; благоустройство территории; емкость 5 м³; емкость 10 м³; емкость 30 м³; цистерна 25 м³ (2 ед.); трансформаторная подстанция; шкаф распределительный С-952/1 (2 ед.); весы ВЭ 15 т; весы ПН-3-1000 платформа весовая РФ; весы Р-30 ИВС; весы РП-100; кран-балка; насосная станция; вентиляционное оборудование. Начальная цена с НДС – 856 054 188 бел. руб. Площадь земельного участка 3,2985 га. Задаток в сумме 50 000 000 бел.руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **16.03.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.03.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

Памяркоўнасць і стабільнасць

У Беларусі ў поўнай меры рэалізуюцца правы і свабоды грамадзян — незалежна ад іх этнічнай ці рэлігійнай прыналежнасці. Гэта паказваюць вынікі шэрагу апытанняў, якія праводзіліся на працягу апошніх гадоў Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта краіны. Апошняе сацыялагічнае апытанне па гэтай тэме праведзена ў канцы 2009 года — ва ўсіх абласных цэнтрах і горадзе Мінску, у шэрагу раённых і сельскіх населеных пунктах было апытана больш як 1000 чалавек. Грамадскае меркаванне па ключавых пытаннях этнічных і канфесійных адносінаў у краіне стабільнае.

Так, больш як 80 працэнтаў апытаных лічаць, што ў Беларусі адсутнічае дыскрымінацыя па нацыянальнай, моўнай і рэлігійнай прыкмеце — **гэта адлюстравана на прыведзенай дыяграме**.

Прычым адсутнасць уціску на этнічнай аснове адзначаюць як прадстаўнікі тытульнай нацыі — беларусы (76 працэнтаў апытаных), так і рускія (73 працэнты), палякі (88 працэнтаў), украінцы (80 працэнтаў). Паказваюць на адсутнасць рэлігійных праследаванняў вернікі вядучых хрысціянскіх канфесій — праваслаўныя (82 працэнты) і каталікі (83 працэнты). Пра выпадкі ўшчамлення правоў грамадзян гаворыць толькі невялікая колькасць рэспандэнтаў: па рэлігійнай прыкмеце — 3 працэнты, моўнай — 4, нацыянальнай прыкмеце — 5 працэнтаў.

Паводле атрыманых звестак, Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай, дзе адсутнічае напружанасць на нацыянальнай і рэлігійнай глебе. Беларускае грамадства ў цэлым свабоднае ад этнічных і канфесійных забабонаў, а беларусы выказваюць памяркоўнасць і талерантнасць адносна прадстаўнікоў іншых народаў і рэлігій. Пераважная большасць насельніцтва (93 працэнты) адзначае спакойны характар міжнацыянальных і міжканфесійных адносінаў, якія склаліся ў краіне.

Дарэчы, калі праводзіць параўнанні з вынікамі аднаведных расійскіх даследаванняў, то, напрыклад, масквічы значна больш занепакоеныя ўзроўнем міжэтнічных узаемаадносінаў у сваім горадзе, чым беларусы ў сваёй краіне: 51 працэнт апытаных жыхароў Масквы лічаць міжэтнічнае становішча ў горадзе напружаным.

Магчымасць узнікнення канфліктаў на нацыянальнай і рэлігійнай глебе ў Беларусі ў найбліжэйшыя гады дапускае толькі нязначная колькасць рэспандэнтаў — менш за 5 працэнтаў. Атрыманыя апошнія звесткі, якія датычацца ацэнкі грамадзянамі характару міжнацыянальных адносінаў, супадаюць з такімі ж звесткамі за 2007 і 2008 гады. Як і год, і два гады таму, станоўча ставіцца да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў каля 80 працэнтаў апытанага насельніцтва Беларусі.

Параўнанне з расійскімі даследаваннямі паказвае, што ўзровень этнічнай талерантнасці расіян значна ніжэйшы, чым у беларусаў. Так, па звестках Усерасійскага цэнтра вывучэння грамадскай думкі, непрыязнасці да іншых народаў няма ў 55 працэнтаў жыхароў Расійскай Федэрацыі.

Вынікі сацыялагічнага даследавання сведчаць пра захаванне сацыякультурнага адзінства беларускага грамадства: прыкладна 80 працэнтаў апытанага насельніцтва адносіць сябе да адной рэлігіі — праваслаўя; столькі ж грамадзян называюць сябе беларусамі.

Падрыхтаваў Антон ЗАПОЛЬСКІ.

Як Вы лічыце, ці ёсць у Беларусі дыскрымінацыя па наступных прыкметах
(варыянты адказу «не», у працэнтах ад колькасці апытаных)



Патрабуюцца... камандзіры і стралок-зенітчык!

Сярод вакансій, якія значацца ў спісе Віцебскага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага гарвыканкама, у ліку іншых ёсць і даволі «арыгінальныя». У прыватнасці, віцебскі філіял РУП авіяцыйнай аховы лясоў мае патрэбу ў камандзіры (пілот, лётчык) паветранага судна, інструктары, а мясцовай вайсковай часці вельмі неабходныя камандзіры аддзялення па абслугоўванні аўтамабільнай і бранятанкавай тэхнікі. Апошніх патрабуецца ажно дзесяць. Заробкі камандзіраў параўнальна невялікія: лётчыку гарантуецца зарплата каля 970 тысяч рублёў, каля 725 тысяч рублёў — «наземным» камандзірам. Працаваць трэба будзе ў адну змену.

А яшчэ ў той жа вайсковай часці можна стаць стралком-зенітчыкам. Ёсць дзве вакансіі з заробкам каля 663 тысяч рублёў.

Сярод самых запатрабаваных мужчынскіх прафесій — будаўнічага профілю, а сярод жаночых вялікі дэфіцыт швачак (можна знайсці працу і інваліду па броні). Патрабуюцца і начальнік — намеснік кіраўніка камбіната сельскагаспадарчага профілю (заробак 1 мільён 200 тысяч рублёў). Для параўнання: машыністу экскаватара пры працаўладкаванні гарантуецца 1,4 мільёна рублёў.

Як сведчаць спецыялісты, у апошні час многія з тых, хто шукае працу, карыстаюцца магчымасцю атрымаць адпаведную інфармацыю, не выходзячы з дому, — на афіцыйным сайце гарвыканкама. Спісы пастаянна абнаўляюцца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Пажар у электрашчытавой

Па папярэдніх звестках, кароткае замыканне ў электрашчытавой стала прычынай пажару вечарам у панядзелак у пяціпавярховым доме па вуліцы Карбышава ў Брэсце. Агонь распаўсюджваўся імгненна, і едкі дым не дазволіў людзям самастойна пакінуць свае кватэры. 10 чалавек былі эвакуяваныя з дапамогай выратавальнікаў. Потым, калі агонь утаймавалі, людзі змаглі вярнуцца дадому. Кватэры і іх насельнікі не пацярпелі.

Яна СВЕТАВА.

«Медычкі» зрабілі абход

Да 78-гадовага дзеда, калі той выходзіў з пад'езда, падышлі дзве дзяўчыны і сказалі, што яны з паліклінікі. Маўляў, робяць абход пажылых і цікавяцца іх здароўем.

Пенсіянер з «медычкамі» вярнуўся дамоў. Пакуль гаспадар расказваў адной з іх пра свае балячкі, другая «праверыла» кватэру.

Вечарам дзед не ўбачыў у шафе прыхаваныя грошы: 1 тыс. долараў і 2,4 млн рублёў. Ён патэлефанаваў сваякам, а тыя — у міліцыю.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Дэфіцытныя тавары — металалом і сухое малако

8 лютага ў Магілёўскай вобласці затрыманы два аўтамабілі з грузамі без дакументаў. У адным з іх быў лом чорных металаў, у другім — сухое малако.

У памежным з Расіяй Клімавіцкім раёне міліцыя спыніла ЗІЛ, які перавозіў каля 1,5 тоны металалому. Вадзіцель з Клімавічаў не змог паказаць дакументаў на груз. У Слаўгарадскім раёне ў аграгарадку Свенск ДАІ спыніла «Фіят», у якім непрацуючы жыхар Кармы перавозіў без суправаджальных дакументаў каля 1,5 тоны сухога малака. Грузы затрыманыя, праводзяцца праверкі.

Алена КАЗЛОВА.

На веласіпедзе па снегу і галалёдзіцы?

8 лютага ў Глускім раёне на дарозе загінуў веласіпедыст. Удзень паблізу вёскі Хвастовічы яго збіў аўтамабіль «Крайслер», якім кіраваў 43-гадовы жыхар Оршы. Рызыкоўны вясковец, якому было 46 гадоў, атрымаў смяротныя траўмы.

У сувязі з гэтым здарэннем Дзяржаўтаінспекцыя нагадвае, што паводле правілаў дарожнага руху ва ўмовах снегападу і галалёдзіцы ехаць на веласіпедзе забаронена.

Ілона ІВАНОВА.

Папарыліся...

Беспрацоўны і прадпрымальнік з Баранавічаў вырашылі папарыцца ў лазні жыхара в. Вялікая Каўпеніца. Парыліся ўсю ноч, а пад раніцу ўбачылі, што знік фотаапарат «SONI» і грошы.

Па заяве пацярпелых міліцыя пачала шукаць невядомага, які абакраў аматараў лазні. Аператыўнікі ўстанавілі, што ў лазні яшчэ была 20-гадовая жыхарка Баранавічаў, на якую і пала падазрэнне.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ІНТЭРНЭТ-КРАМА ДЛЯ ЗНЯВОЛЕНЫХ

У Алтайскім краі адчынілася інтэрнэт-крама «Передачки.ру». Яна дазваляе купіць прадукты харчавання для грамадзян, якія адбываюць зняволенне ў адной з калоній рэгіёна.

У асартыменце «Передачек.ру» звыш сотні пазіцый. Асуджаным можна перадаць газаваную і мінеральную ваду, кандытарскія вырабы, гарбату і каву, сокі, малочную, мясную і рыбную прадукцыю. У асартымент таксама ўваходзіць чырвоная ікра, шакалад. За прадукты можна заплаціць у банку або на пошце.

ДЗЕ «ЗВЯЗДА», ТАМ ПЕРАМОГА!

«Дзякуй, што дапамаглі ўратаваць шляхетных птушак!..»

У нумары ад 26 студзеня мы паведамілі трывожную інфармацыю: у Мінску, на вуліцы Маякоўскага на рацэ гінуць ад голаду лебедзі, якія з розных прычынаў не адляцелі ў вырай.

Пенсіянер Уладзімір ВАШКЕВІЧ здзейсніў тады сапраўдны подзвіг: за два дні падняў на вушы ўвесь горад, абзваніў чыноўнікаў і СМІ. І вось учора Уладзімір Іванавіч зноў патэлефанаваў у рэдакцыю.

— Лічу, што менавіта «Звязда» дапамагла ўратаваць птушак, — цешыўся Вашкевіч. — Пасля вашай публікацыі адгукнулася столькі людзей, столькі ўстановаў!.. Дазвольце выказаць ім падзяку праз газету. Дапамогу аказала прадпрыемства «Мінскзелянбуд», у прыватнасці, арганізаваў усіх старшыня аб'яднанага прафкама Аляксандр Салановіч. Адгукнуўся гастраном «Асаблівы» — аддаюць мне рэшту непрададзеных батонаў. Прывезлі пачастунак птушкам міліцыянты з Першамайскага АВІРу, супрацоўнікі 22-й стаматалагічнай паліклінікі, Мінскага завода халадзільнікаў «Атлант», прадпрыемства «Салідэкс-ПІ», Мінскай лесапаркавай гаспадаркі. Я ўражаны, колькі ў нас добрых людзей!.. Прыходзілі і студэнты, і школьнікі, і пенсіянеры. Адна жанчына прыехала нават з Пухавічаў, прачытаўшы заклік у «Звяздзе»! Іншы чалавек — ходзіць на мыліцах, але прыехаў на машыне...

Уладзімір Іванавіч кажа, што агульнымі намаганнямі ўдалося ўратаваць птушак ад галоднай смерці (раней памерлі некалькі асобінаў). І нават больш — на момант публікацыі птушак было 23, а зараз — 36! Напэўна, актыўная кармёжка была заўважаная і іншымі лебедзямі, якія зімуюць у Мінску і ваколіцах...

І гэта проста цудоўна, калі людзі ідуць на дапамогу такім прыгожым, але безабаронным перад маразамі, птушкам!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.

БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ЦУД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля выставы партнёраў у Беларусі стане яшчэ больш. Сёлета будзе больш актыўным супрацоўніцтва ў галіне інфармацыі паміж Украінай і Беларуссю. Ужо ў першы дзень працы выставы быў падпісаны План мерапрыемстваў на 2010 год Міністэрства інфармацыі Беларусі і Дзяржаўнага камітэта тэлебачання і радыёвяшчання Украіны па рэалізацыі пагадненняў паміж урадам Беларусі і Кабінетам Міністраў Украіны. **Прадстаўнік Дзяржтэлерадыё Украіны Алег НАЛІВАЙКА**, які ад украінскага боку паставіў подпіс пад дакументам, назваў нашу выставу знакавым мерапрыемствам для еўрапейскай супольнасці і адзначыў:

— Поспех падобных мерапрыемстваў забяспечваюць шырокае прадстаўніцтва і колькасць удзельнікаў. Гэта месца, дзе заключаюцца эфектыўныя кантракты, бо кнігавыдавецкая галіна — адзін з фактараў развіцця эканомікі. Але ў той жа час выстава сведчыць пра духоўнасць нацыі, якая ў такі складаны час думае пра кнігавыданне.

Кнігі ў Беларусі ствараліся ў розныя часы. І сёння ў нас ёсць выбар, што і каго чытаць. Усяго пяць дзён на тое, каб выбраць і не доўга вагацца, а купіць. Аднак менавіта на выставе ёсць унікальная магчымасць атрымаць у сваю калекцыю кнігі з аўтографамі аўтараў. Сёлета гасцямі мінскай кніжнай выставы, акрамя французскіх пісьменнікаў, стануць расійскія, напрыклад, вельмі актыўна ўдзельнічаць у розных

сустрэчах будзе Міхаіл Велер, вядомы не толькі па літаратурных творах, але і па частых з'яўленнях у розных тэлеперадачах. Што адметна — сёлета расійскія выдавецтвы таксама будуць здзіўляць нашых чытачоў выданнямі твораў беларускіх творцаў, напрыклад, зборніка Рыгора Барадуліна «Перакуленае/Опрокинутое» — трэба думаць таму, што ён цікавы як нашаму, так і расійскаму чытачу.

Аднак беларускія выдавецтвы таксама шукаюць шлях да сэрцаў людзей, імкнучыся прапанаваць рэдкія і ўнікальныя выданні. Галоўным сюрпрызам сёлета можна назваць факсімільнае выданне помніка беларускага пісьменства «Слуцкага Евангелля». Будуць прэзентацыі кніг беларускіх аўтараў, якія ствараюць беларускія бестселеры — напрыклад, Вольга Тарасевіч.

Ісці да чытача сёлета маюць намер члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, якія на выставе будуць прысутнічаць асабіста. Хоць старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец прызнаў, што іх кніг трэба выдаваць больш — асабліва маладых аўтараў, каб іх падтрымаць. Акрамя таго, ён звярнуў увагу на неабходнасць выдаць усіх пісьменнікаў — удзельнікаў вайны, якія яшчэ жывыя. І ўдакладніў — у Саюзе пісьменнікаў Беларусі іх 21 чалавек. Кнігі пісьменнікаў-ветэранаў дэманструюцца на выставе. А яшчэ ёсць тыя, хто піша фантастыку, ці дэтэктывы. Для іх заснаваныя новыя серыі «Фантастыка і прыгоды» і «Дэтэктыў». Так, нашы літаратары ідуць у нагу з часам...

А куды ідзём мы? Няўжо не па кнігі?

Ларыса ЦІМОШЫК.

ДЭФІЦЫТУ БУДМАТЭРЫЯЛАЎ ДЛЯ «ІНДЫВІДУАЛАЎ» СЁЛЕТА НЕ БУДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Для гэтай катэгорыі забудоўшчыкаў будзе прапаноўвацца часткова і замежны цэмент?

— Айчынныя будматэрыялы, у тым ліку цэмент, газасілікатныя блокі і іншыя матэрыялы, нацэленыя на выкананне агульнай жыллёвай праграмы. А індывідуальнае будаўніцтва штогод адпавядае 33—36 працэнтам агульнага аб'ёму жылля, якое ўзводзіцца ў краіне.

— З улікам магчымага дэфіцыту цэменту, ці можа павялічыцца кошт будматэрыялаў для індывідуалаў?

— Гэтага будучага дэфіцыту ніхто яшчэ нідзе і не «бачыў». Магчыма, для буйных прыватных забудоўшчыкаў і будзе сёлета неякі недахоп цэменту, але і гэта яшчэ не факт. А вось для дзяржаўных праграм, такіх, як жыллёвае будаўніцтва, ніякага дэфіцыту няма і не будзе.

— За мінулы год заданне будаўнікі выканалі, але ж сёлета трэба прыплюсоўваць яшчэ мільён...

— Летась у Беларусі было пабудавана 5 млн 850 тысяч квадратных метраў жылля. Пачатак гэтага года адзначыўся для нашых спецыялістаў не толькі вялікімі планамі па будаўніцтве жылля, але і складанымі ўмовамі надвор'я, калі працяглы час трымаліся моцныя маразы. Разам з тым, кіраўніцтва галіны ўпэўнена ў выкананні гадавога задання па будаўніцтве 6 млн 960 тысяч квадратных метраў жылля. У Мінску гадавое заданне сёлета зніжана на 200 тысяч і складае 1,2 млн кв. метраў. У разрэзе абласцей больш за ўсё плануецца пабудаваць жылля ў Мінскай вобласці — 1,33 млн кв. метраў, што амаль на 250 тысяч «квадратаў» больш чым летась.

У студзені ў краіне было пабудавана 285 тысяч кв. метраў жылля. Для першага святочнага і даволі марознага месяца гэта нармальна. Галоўнае, што адбыліся масавыя закладзіны і пачалося будаўніцтва будучых дамоў.

— Мінску план паменшылі, але менавіта ў сталіцы захоўваецца самая вялікая чарга...

— Ва ўсіх краінах сталіцы прыцягваюць да сябе актыўную частку насельніцтва. Хутчэй за ўсё, у найбліжэйшыя гады ў Мінску будзе будавацца каля 1,2 млн квадратных метраў. Аднак, каб толькі захоўваць гэтыя вялікія аб'ёмы будаўніцтва, трэба актыўна развіваць прыгарады мегаполіса. Весці там масавае індывідуальнае будаўніцтва і ўзвядзенне шматкватэрных дамоў. З цягам часу неабходна будзе ажыццявіць пашырэнне мяжы Мінска з далейшым выхадам за кальцавую дарогу.

Летась добра спрацавала сістэма льготнага крэдытавання долевага будаўніцтва ў Мінску. Ініцыятыву гарвыканкама падтрымала наша міністэрства, а потым Нацбанк і Беларусбанк. Гэта дазволіла летась заключыць каля 2700 дагавораў па долевым будаўніцтве з выкарыстаннем ільготных крэдытаў. Значыць, у Мінску за мінулы год жыллёвая чарга паменшылася амаль на 3 тысячы сем'яў. Аднак... Летась назіраўся ажыятаж вакол новых правілаў пастаноўкі на ўлік у жыллёвую чаргу. Так, калі летась на пачатак года ў Мінску ў чарзе было 247 тысяч чалавек і сем'яў, то сёлета — ужо 268 тысяч. Мабыць, большасць жыхароў сталіцы вырашылі «выціснуць» усё магчымае з існуючай схемы і на ўсякі выпадак стаць у чаргу яшчэ да 19 лютага.

— Аднак у студзені «чаргавікам» на долевае будаўніцтва льготных крэдытаў не давалі.

— Так, не давалі. Рашэнне гарвыканкама дзейнічала толькі на 2009 год. Цяпер у мэрыі сталіцы завяршаюцца перамовы аб магчымым працягванні і на 2010 год ільготнага крэдытавання для ўдзельнікаў долевага будаўніцтва.

— Каб «разгрузіць» сталіцу, разглядаецца ідэя стварэння гарадоў-спадарожнікаў?

— У першую чаргу гарады-спадарожнікі запланавана арганізоўваць у бліжэйшых да сталіцы населеных пунктах — Смалявічах і Заслаўі. Там цяпер праекціроўшчыкі працуюць над распрацоўкай суцэльных жылых кварталаў з узвядзеннем дадатковай сацыяльнай інфраструктурай — дзіцячымі садкамі, школамі, гандлёвымі аб'ектамі і інш. Паралельна з будаўніцтвам да гэтых гарадоў будуць узмацняцца транспартныя зносіны.

— Будаўніцтва новага жылля там пачнецца ўжо сёлета?

— Не ўпэўнены, бо... Цяпер там ідзе падрыхтоўка праектнай дакументацыі, працягваецца пошук будаўнічых пляцовак, трэба вырашаць пытанні пашырэння камунальных магутнасцяў, дадатковых інжынерных сетак па цяпле, вадзе, газе і электрычнасці. Сутнасць у тым, што там плануецца дадаткова пабудаваць не адзін жылы дом, а адразу тысячы кватэр. Новыя жылыя кварталы ў гарадах-спадарожніках плануецца будаваць менавіта для чаргавікоў сталіцы.

— Як плануецца развіваць будаўніцтва жылля ў іншых буйных гарадах краіны? Магчыма, ужо існуюць напрацоўкі аб стварэнні міні-спадарожнікаў вакол абласных цэнтраў?

— Сёння такой неабходнасці няма. Хапае патэнцыйных будаўнічых пляцовак у існуючых межах буйных гарадоў. Не ўсе нашы гарады цяпер шчыльна забудаваныя. Сустракаецца нават у цэнтры гарадоў стары прыватны сектар, які з цягам часу будзе знесены. У межах рэгіянальных праграм канцэпцыі даступнага і камфортнага жылля ў апошнія гады былі дапрацаваны генеральныя планы ўсіх буйных і сярэдніх гарадоў.

— У свой час актыўна вяліся размовы аб вышынным будаўніцтве. Крызіс паламаў гэтыя грандыёзныя планы?

— Запланаваныя праекты па сучасных жылых хмарачосах будуць рэалізоўвацца. Крызіс крыху прытармазіў тэрміны будаўніцтва такіх аб'ектаў. Вышынныя жыллёвыя будынкі збіраюцца ўзводзіць прыватныя буйныя інвестары ў комплексе з адміністрацыйнымі пабудовамі, бізнэс-цэнтрамі, гасцініцамі і гандлёвымі аб'ектамі.

— Цэны на жыллёвыя квадраты на другасным рынку рэгулююцца максімальнымі попытам і прапановай, а якімі яны будуць па кватэрах, што будуюцца з дзяржаўнай падтрымкай для чаргавікоў?

— Паводле вынікаў мінулага года, у сярэднім па рэспубліцы кошт квадратнага метра кватэр для чаргавікоў склаў 470—500 долараў. Сёлета сабекошт будаўніцтва жылля можа павялічыцца максімум на 15 працэнтаў. Але і кошт замежных валют можа змяніцца. Канчатковыя цэны на жыллё будуць залежаць ад агульнай эканамічнай сітуацыі ў краіне. Калі сёлета эканамічная сітуацыя істотна не зменіцца, то і жыллёвы квадрат для чаргавікоў будзе каштаваць каля 500 долараў, плюс-мінус некалькі працэнтаў. З цягам часу можа падаражэць будаўніцтва камерцыйнага жылля, аднак і на гэтым сегменце за той ці іншы цэнасны ўзровень галасаваць рублём будуць выключна спажыўцы.

Абзац

◢ У Беларусі ў кожнага другога вучэбнага аўтамабіля ў ходзе нядаўняй праверкі, якую праводзілі УП «Белтэхагляд» і ДАІ, выяўлены самыя розныя парушэнні. Было праверана больш за 4,3 тыс. транспартных сродкаў. У прыватнасці, больш за 670 з іх не прайшлі дзяржтэхагляд своечасова.

◢ Кантрабандысты спрабавалі пераправіць буйную партыю цыгарэт у вагонах з вугалем з Беларусі ў Польшчу. Больш за 13 тыс. пачкаў цыгарэт беларускай вытворчасці брэсцкія памежнікі выявілі ў трох вагонах з вугалем. Цягнік кіраваўся на польскую чыгуначную станцыю Малашэвічы з Брэста. Пакуль невядома, хто менавіта спрабаваў пераправіць кантрабанду.

◢ У выніку сутыкнення з КрАЗам, які перавозіў пад'ёмны кран, у Салігорскім раёне загінуў вадзіцель велікагрузнага аўтамабіля. Мінчанін, які кіраваў фурай, на трасе Мінск—Мікашэвічы пры манеўры зачапіў кабінай КрАЗ. Фура перавярнулася, кіроўца загінуў. КрАЗ рухаўся ў суправаджэнні патрульнай машыны ДАІ. Ідзе расследаванне.

◢ У Баку быў абрабаваны пасол Венгрыі ў Азербайджане Жэно Барос. Невядомы на вуліцы папрасіў у пасла мабільны тэлефон, каб пазваніць. Атрымаўшы апарат, ён збег. Дыпламат звярнуўся ў паліцыю. Зламыснік пакуль не знойдзены.

◢ Салодкая газіроўка садзейнічае развіццю раку падстраўнікавай залозы. Амерыканскія вучоныя выявілі, што ўжыванне дзвюх і больш шклянак салодкіх газаваных напояў за тыдзень павышае рызыку развіцця раку падстраўнікавай залозы амаль удвая. Высветлілася, што ў добраахвотнікаў, якія ўжывалі дзве і больш (у сярэднім пяць) порцый салодкай газіроўкі за тыдзень, рызыка развіцця гэтага віду раку на 87 працэнтаў вышэйшая, чым у астатніх. Пры гэтым сувязі паміж ужываннем соку з садавіны і ракам падстраўнікавай залозы выявіць не ўдалося. Па словах кіраўніка даследавання дацэнта Марка Перэйры, такое дзеянне газіроўкі можа быць звязана з высокім утрыманне цукру, які стымулюе выпрацоўку ў астраўках падстраўнікавай залозы інсуліну, які, у сваю чаргу, садзейнічае росту ракавых клетак. Акрамя таго, выяўленая заканамернасць можа быць вынікам таго, што аматары салодкіх газаваных напояў менш схільныя да здаровага ладу жыцця.

Поўны абзац

◢ У прадуктовых крамах Ерэвана з'явіліся ў продажы курыныя яйкі з пячаткай міністэрства абароны Арменіі. Высветлілася, што размова ідзе аб прадукцыі фірмы «Аракс», якая раней выйграла тэндар на пастаўку яек ваеннаму ведамству. Якім чынам яйкі, што прызначаліся для міністэрства абароны, трапілі на прылаўкі, пакуль невядома. Расследаваннем занялася ваенная паліцыя. Пастаўшчыкі і прадаўцы крамаў дапытаныя. Выявілася, што фабрыка, згодна з дамовай, павінна пастаўляць ваенным яйкі першага гатунку, а на прылаўкі трапіла прадукцыя другога гатунку.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

HONDA АДКЛІКАЕ БОЛЬШ ЗА 378 ТЫС. АЎТАМАБІЛЯЎ З-ЗА ДЭФЕКТУ ПАДУШКІ БЯСПЕКІ

Кампанія Honda адклікае 378 тыс. 758 аўтамабіляў з-за няспраўнасці помпы для падушкі бяспекі, паведамляюць інфармагенцтвы.



Паводле інфармацыі экспертаў кампаніі, дэфект можа прывесці да таго, што падушка ўдарыць па вадзіцелю з вельмі вялікай сілай і такім чынам можа нанесці цялесныя пашкоджанні або нават забіць. У лютым з аўтамабілямі Honda адбылося 12 такіх інцыдэнтаў, адзін з якіх скончыўся смерцю вадзіцеля.

Адкліканню падлягаюць аўтамабілі, прададзеныя ў ЗША, мадэляў Accord, Civic, Odyssey and CR-V 2001 і 2002 гадоў выпуску.

У лістападзе 2008 года па гэтай жа прычыне Honda адклікала 3 тыс. 900 аўтамабіляў мадэляў Civic і Accord, а ў ліпені 2009 года кампанія паведаміла амерыканскай Нацыянальнай адміністрацыі бяспекі руху на шашы і на дарогах аб адкліканні яшчэ 440 тыс. аўтамабіляў. У выніку праведзенага ведамствам расследавання высветлілася, што Honda прыняла рашэнне аб адкліканні бракаванай прадукцыі несвоечасова і можа панесці за гэта адказнасць. Прадстаўнікі кампаніі, у сваю чаргу, заяўляюць, што затрымка адкліканння аўтамабіляў была звязана з неабходнасцю ў поўным аб'ёме вывучыць усю інфармацыю.

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Местонахождение объекта	г. Сморгонь, ул. Мицкевича, У-55а
Кадастровый номер	425650100001003837
Площадь участка (га)	0,0096
Целевое использование	Строительство торгового павильона
Ограничения в использовании земельного участка	Охранная зона кабеля связи на площади 0,0036 га
Срок аренды	50 лет
Начальная цена (руб.)	1 544 134
Сумма задатка (руб.)	154 410

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:
заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона;
заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3641526001461 в АСБ «Беларусбанк», код банка 504, УНП 500108328, код платежа 4902, получатель платежа – Сморгонский райисполком.

Гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

Индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность.

Юридическое лицо – представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о гос. регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь – представителю или уполномоченному должностному лицу иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

Представитель иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещает покупатель объекта.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

Аукцион состоится 17 марта 2010 года в 11.00 по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5 в малом зале заседаний.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5, каб. 302 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Телефоны для справок в **г. Сморгонь: 8 01592 3 23 41, 3 17 23, 3 23 91.**

Заявления принимаются **по 11 марта 2010 года до 17.00 включительно.**

І ПЕРНІКАМ, І ПУГАЙ

Баранавіцкія камунальнікі працягваюць змагацца з даўжнікамі, якія не аплачваюць камунальныя паслугі.

У мясцовай прэсе друкуюцца прозвішчы даўжнікоў з адрасамі, праводзяцца заахвочвальныя акцыі, супрацоўнікі ЖРЭУ імкнуцца «выбіць» запазычанасць, як кажуць у такіх выпадках, пернікам і пугай.

Летась добрасумленныя грамадзяне, якія разлічваліся ў вызначаны тэрмін, маглі набыць ў краме «Тэхна» бытавую і аргтэхніку з 3-працэнтнай зніжкай. Чалавек павінен быў узяць у ЖРЭУ даведку і пайсці па тэхніку ў краму. Такіх пакупнікоў набралася 37 чалавек, а сума зніжак склала 1 млн 800 тыс. рублёў. Як бачым, акцыя прыцягнула ўвагу грамадзян, хоць і не масавай атрымалася, але тым не меней.

У 2009 годзе даўжнікам было ўручана 6775 папярэджванняў на адключэнне камунальных паслуг, а ў амаль 2 тысяч грамадзянаў яны былі адключаны. Але даўгі перайшлі на гэты год, і на 1 студзеня пратэрмінаваная запазычанасць па горадзе складае больш чым 233 млн рублёў.

Самая малая запазычанасць у апублікаваным спісе — 6-7 месяцаў і сумы тут не такія вялікія — 114—307 тыс. рублёў, але многія жыхары не плацяць па 50—97 месяцаў, і даўгі там мільённыя. Чалавек не плаціў 6 гадоў і доўгу ў яго набралася за 3 млн рублёў. Як з такога даўжніка «выбіць» грошы? Немагчыма, найперш таму, што такой сумы ў яго няма і наўрад ці будзе. У адной кватэры па вул. Касманаўтаў тры гаспадары, а ніводзін не плаціць.

Камунальнікі падаюць на даўжнікоў і ў суд. Напрыклад, летась іскавых заяў было накіравана 1800 і амаль усе яны былі задаволеныя. Але чым можна кампенсаваць той доўг, калі ў чалавека ў кватэры пуста? Адзіны тэлевізар забіраць нельга, халадзільнік таксама, праўда, калі гаспадар пенсіянер, то пэўны працэнт ад пенсіі па рашэнні суда адлічваюць. А наконт высялення, то тут увогуле складаная сітуацыя. Калі з бацькамі пражываюць няпоўнагадовыя дзеці, калі састарэлыя жывуць, калі... і выселіць даўжнікоў немагчыма. Хоць у судзе і ёсць заявы на высяленне, але ўдалося толькі аднаго даўжніка пазбавіць кватэры — выселіць без забеспячэння яго жыллём.

Адзначу адзін момант. Даўжнікі прывольна сябе адчуваюць, найперш у дамах, якія знаходзяцца ў сістэме гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а ў жыллёвых кааператывах сітуацыя іншая.

Перагаварыў з некалькімі старшынямі кааператываў (ды і сам жыву ў такім) і пачуў, што не было ніводнага выпадку, каб справа з даўгамі дайшла да суда. Бывае, нехта не заплаціць месяц-другі, але стараецца разлічыцца. Можа, гэта звязана з тым, што ў жыллёвых кааператывах меней выпадковых людзей? Калі чалавек пабудаваў кватэру на свае грошы, то ў яго ёсць пачуццё адказнасці.

Сёлета ЖРЭУ г. Баранавічы вырашыла правесці яшчэ адну акцыю, і на гэты раз сярод даўжнікоў. Калі ўладальнікам кватэры з'яўляецца мужчына, то ў яго ёсць магчымасць пагасіць запазычанасць за камунальныя паслугі да 23 лютага і мець надзею на прыз ад камунальнікаў. А жанчыны могуць атрымаць падарунак, калі ў іх не будзе даўгоў да 8 сакавіка. У гэтай акцыі могуць браць удзел тыя, чыя запазычанасць ад трох і болей месяцаў. Акцыя праводзіцца сумесна з крамай «Аўтарытэт». Розыгрыш прызоў адбудзецца 17 сакавіка. Сярод прызоў будуць: мікрахвалевая печ, DVD-прайгравальнік, прас, электрачайнік...

А ці прыцягнуць гэтыя прызы даўжнікоў? Пачакаем.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Званок у карпункт

КАСАВЫ АПАРАТ УСТАЛЯВАНЫ

**У Гомельскі карпунк

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

11 лютага 2010 г. № 6 (200)

РАЗБОР «ПАЛЁТАЎ»

ПРА ХІБЫ ЖЫЦЦЯ — УСЛЫХ І ПРЫ НАРОДЗЕ

У аграгарадку Баркалабава на сельскім сходзе публічна выхоўвалі нядбайных бацькоў, п'яніц і правапарушальнікаў

У Быхаўскім раёне адрадзілі даўнюю традыцыю правядзення сходаў, на якіх абмяркоўваюць праблемы бяспекі жыцця, праводзіцца прафілактыка п'янства і правапарушэнняў. 4 лютага такі сход прайшоў у Баркалабаўскім сельсавеце.

Напярэдадні сходу адбыліся канцэрт мастацкай самадзейнасці і выставы-продажы. У мясцовым Доме культуры наладзілі гандаль гаспадарчымі і харчовымі таварамі. Міліцыя зрабіла выставу канфіскаванай зброі і злачынных прыладаў. Выратавальнікі на радасць дзятве дэманстравалі шырокія магчымасці новай спецтэхнікі.

У глядацкай зале Дома культуры быў аншлаг: заняты ўсе паўтары сотні месцаў, ды яшчэ ў прыходах людзі стаялі. У прэзідыуме — прадстаўнікі ўлады, МНС, міліцыі, суда і пракуратуры. Вёў сход **старшыня Баркалабаўскага сельскага Савета Іван СКРЫПЦОЎ**.

Курэнне ў ложку ў п'яным стане, наступствы пажараў і прыродных катаклізмаў, прадухіленне крадзяжоў электраэнергіі, правілы бяспечнага карыстання газавым абсталяваннем — гэта далёка не ўсе тэмы прамоў на сходзе. Да таго ж словы ілюстраваліся відэафільмамі: у іх наглядна паказвалі, як людзі спачатку п'юць гарэлку, а потым збіваюць сваякоў, учыняюць злачынствы, валяюцца пад агароджамі, дзе, здараецца, часам і паміраюць.

Убачылі сябе на вялікім экране і некаторыя мясцовыя жыхары.

— Мы засяродзілі ўвагу не на пенсіянерах, якія жыццё дажываюць, а на маладых людзях, якія выхоўваюць дзяцей, — расказаў Іван Скрыпцоў. — Вось і прайшлі па трох няўдалых сем'ях. У адной знайшлі незаконную электрапробку, у іншай дзеці разабралі адзін з пажарных апавяшчальнікаў, а ў трэцяй маці аказалася ў нецвярозым стане. Таму нашы «зоркі» чырванелі і нават плакалі пад шумок залы.

Ёсць і станоўчыя прыклады. Сям'я, у якой выхоўваецца 5 дзяцей, яшчэ нядаўна таксама стаяла на ўліку як няўдалая. Цяпер бацькі выправіліся, маюць добрую рэпутацыю. Значыць, можна і з такімі праблемамі справіцца!

Нягледзячы на тое, што колькасць злачынстваў і правапарушэнняў у Баркалабаўскім сельсавеце скарацілася летась на трэць, усё ж і тут ёсць праблемы. Напрыклад, міліцыя прадэманстравала, як мужчына прадаваў віно з-пад крыса. Яшчэ трох п'яных заўважылі ў грамадскіх месцах.

Парушальнікаў запрасілі на сцэну ды прымусілі апраўдвацца пры ўсім народзе. Давалі выказацца і іх аднавяскоўцам: былі і заступнікі, але большасць антыграмадскія паводзіны асудзіла.

— Народ не падманеш, — разважае старшыня сельскага Савета. — Людзі пыталіся ў маці, як яна будзе ў вочы аднавяскоўцам глядзець, калі ў яе забяруць дзяцей і зробяць абавязанай асобай. Іншыя гаварылі, што вясковае жыццё досыць цяжкае. А ім пярэчылі: маўляў, пасля вайны галадалі, але дзяцей гадавалі такім чынам, што на іх цяпер дзяржава трымаецца. Карацей, сход быў напоўнены эмоцыямі і доўжыўся дзве гадзіны.

Каб замацаваць уражанне, медык расказаў пра наступствы п'янства для арганізма чалавека, а праваслаўны святар — для душы.

Паводле прапановы **старшыні Быхаўскага раённага Савета дэпутатаў Валерыя ШКАПЦОВА**, баркалабаўскія вяскоўцы прынялі на сваім сходзе рэзалюцыю. Усе пагадзіліся, што намаганні службаў і саміх людзей трэба накіраваць на барацьбу і прадухіленне п'янства. Самае галоўнае — не быць абыякавымі да праблемаў сваіх суседзяў і аднавяскоўцаў і дапамагаць тым, хто трапляе ў цяжкую жыццёвую сітуацыю.

— Мяркую, што людзі, праблемы якіх абмеркавалі на сходзе, адчулі ўсё і будуць выпраўляцца, — дадаў Іван Скрыпцоў. — У нас ёсць сем'і, якія літаральна жывуць пад наглядам: раніцай іх канвоіруе школа, удзень — сельскі Савет, увечары — міліцыя. Супраць такіх і накіраваны метад прынароднага разбору.

Ілона ІВАНОВА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«СКАЖЫЦЕ, МАМА НЕ ЗВАНІЛА?»

Пасля прыняцця Дэкрэта № 18 колькасць дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, у Чашніцім раёне зменшылася ўдвая. Па-першае, больш кантралюючых органаў цяпер задзейнічана ў рабоце з «цяжкімі» сем'ямі, па-другое, больш жорсткімі сталі меры, якія прымяняюцца да гора-бацькоў.

— Сітуацыя з няўдалымі сем'ямі ў раёне была некрытычная і да выхаду Дэкрэта № 18, — патлумачыла начальнік аддзела адукацыі райвыканкама Валянціна КАВАЛЕНКА. — Проста раней гэтым займаліся мы, камісія па справах няпоўнагадовых, інспекцыя па справах няпоўнагадовых. А Дэкрэт абавязаў працаваць усе службы ў адной запрэжцы, таму і вынікі атрымаліся лепшыя. У нашым аддзеле створаны каардынацыйны савет па выяўленні і ўліку няпоўнагадовых, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы і маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне. У яго склад уваходзяць прадстаўнікі раённай бальніцы, рэгіянальнай газеты, аддзела ўнутраных спраў, ваенкамата, МНС, камунальнікі і нават протаіерэй мясцовага прыхода. Можна казаць, што ўвесь раён працуе па гэтым Дэкрэце.

Кожная служба, кожная арганізацыя адчула сваю адказнасць за становішча спраў у няўдалых сем'ях. Цяпер не толькі школу гэта стала хваляваць, але абсалютна ўсіх. Напрыклад, кіраўнік СВК сёння на роўных з дырэктарам школы адказвае за становішча спраў у такой сям'і. Сумесная скаардынаваная дзейнасць і дала магчымасць атрымаць большы станоўчы эфект.

Дзяцей у нядбайных бацькоў забіралі ў дзяржаўныя ўстановы і раней, але з выхадам Дэкрэта ўвага была сканцэнтраваная менавіта на ўзмацненні адказнасці абавязаных татаў і маці па кампенсаванні расходаў дзяржавы на ўтрыманне малых. Адпаведна ўзрасла і адказнасць бацькоў за выхаванне сваіх дзяцей.

— Усім патлумачылі палажэнні гэтага Дэкрэта, і людзі падлічылі, колькі ў іх будзе заставацца грошай пасля таго, як з іх вылічаць за ўтрыманне дзяцей, — працягвае Валянціна Уладзіміраўна. — Гэта стала свайго роду выхаваўчым момантам, прычым даволі дзейсным. Многія нядбайныя бацькі задумаліся і прыйшлі да высновы, што лепш яны самі буду выхоўваць сваіх малых, чым плаціць за іх выхаванне дзяржаве.

У раёне ёсць шмат прыкладаў, як пагроза «пакарання рублём» прымусіла выпівох змяніцца. Так, у разведзенай грамадзянкі А. з-за яе празмернай схільнасці да алкаголю траіх дзетак дзяржаўныя службы забралі ў прытулак (разглядалася пытанне аб пазбаўленні яе правоў на дзяцей). Як абавязаная асоба жанчына вымушана была плаціць у месяц па 160 тысяч рублёў на кожнага малога. Такое фінансавае ўзрушэнне моцна паўплывала на маці. Яна ўзялася за розум, кінула піць, уладкавалася на працу. Дзяцей ёй вярнулі, і цяпер атмасфера ў сям'і нармальная.

Не сакрэт, што далёка не ўсе прадпрыемствы ахвотна бяруць абавязаных асобаў у штат — гэта не самыя надзейныя работнікі.

— Звычайна такіх людзей мы ўладкоўваем на працу па месцы жыхарства, і цяжкасяў, як правіла, з гэтым не ўзнікае. У нас цэнтр занятасці насельніцтва займае вельмі жорсткую пазіцыю ў гэтым пытанні, — патлумачыла Валянціна Каваленка. — І кіраўнікі прадпрыемстваў пра гэта добра ведаюць. Яны, зразумела, моцнага энтузіязму не праяўляюць, але на працу абавязаных асобаў бяруць. Ведаюць: у выканкаме, калі што, спытаюць, ды і ўсё ж агульная гэта справа.

Абавязаных асобаў, як правіла, уладкоўваюць у арганізацыі сельскай гаспадаркі. Напрыклад, на ферме ў СВК «Іванскі» даярка сёння атрымлівае 850 тысяч рублёў. У іншых гаспадарках раёна заработная плата ніжэйшая (дзесьці 350 тысяч), але Валянціна Уладзіміраўна падкрэсліла, што калі ў чалавека ёсць жаданне працаваць, яму абавязкова дапамогуць, дадуць дадатковую магчымасць. Зарабіць грошы — калі працуеш добрасумленна — можна і ў сельскай гаспадарцы. Нехта з абавязаных асобаў працуе ў сістэме ЖКГ, нехта — тэхнічнымі работнікамі ва ўстановах адукацыі.

Калі ў чалавека забіраюць дзіця ў прытулак, ён ужо лічыцца абавязанай асобай і пералічвае грошы прытулку. На адно дзіця — 320 тысяч у месяц. Калі ў чалавека заробак меншы ці дзяцей некалькі (3-4), і з гэтай прычыны ён не можа выплачваць суму цалкам, тады ён адлічвае 70 працэнтаў свайго заробку. Магчыма сітуацыя, калі рашэннем суда — пры наяўнасці важкіх прычын — сума штомесячных выплат на дзяцей можа быць зменшана. Але кампенсаваць расходы дзяржавы цалкам усё адно прыйдзецца, проста гэтае «задавальненне» расцягнецца на значна большы перыяд. За паўгода, што няпоўнагадовыя знаходзяцца ў прытулку, нядбайныя таты і мамы маюць шанц узяцца за розум (навесці парадак у хаце, закадзіравацца, уладкавацца на працу) — тады дзяцей ім вяртаюць. У адваротным выпадку іх пазбаўляюць бацькоўскіх правоў і яны будуць абавязаны аплачваць утрыманне дзяцей гадамі, пакуль тыя не вырастуць.

— Мы не адразу забіраем дзіця з сям'і, — падкрэсліла начальнік аддзела адукацыі. — Праблемную сям'ю мы спачатку ставім на ўнутрышкольны ці ўнутрысадкоўскі ўлік. Калі папярэдняя работа вынікаў не дае, прызнаём сям'ю СНС (у сацыяльна небяспечным становішчы). Складаем новыя праграмы работы, задзейнічаем іншыя службы (і СВК, дзе бацькі працуюць, і ФАПы, і ўчастковага міліцыянера і г.д.). Выклікаем бацькоў на камісію пры сельскім Савеце, на пасяджэнне каардынацыйнага савета ў аддзел адукацыі. І толькі калі і гэтая работа не дае станоўчага эфекту, прызнаём дзіця маючым патрэбу ў дзяржаўнай абароне і змяшчаем у сацыяльны прытулак. На ўсіх гэтых этапах ідзе мэтанакіраваная работа з сям'ёй па наладжванні дзіцяча-бацькоўскіх адносінаў. Вы ж разумееце, калі бацькі ўжо аддаюць перавагу не дзецям, а алкаголю, ні пра якія нармальныя стасункі ў сям'і гаварыць не даводзіцца. Асноўная задача ўсіх нашых службаў — наладжванне такіх стасункаў і стварэнне нармальных умоваў для таго, каб дзіця можна было вярнуць. Усе службы раёна задзейнічаны ў тым, каб вывесці сям'ю з крызіснай сітуацыі. І, як правіла, вяртанне дзяцей у біялагічныя сем'і ў нас перавышае 50 працэнтаў.

Праўда, дадала Валянціна Уладзіміраўна, былі выпадкі, калі дзетак бацькам вярталі, а потым надараўся рэцыдыў, і малых паўторна даводзілася адпраўляць у прытулак. Напрыклад, маладая жанчына, якая пражывала са сваёй маці, нарадзіла дзіця па-за шлюбам і не змагла забяспечыць малому нармальныя ўмовы пражывання. Дзіця забралі ў прытулак.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Матэматыка з геаграфіяй

Жыхары Чыжахі лічаць сваю вёску цэнтрам Еўропы

Гэты край нібыта абышлі бокам «гучныя» гістарычныя падзеі, тут ніколі не было сваёй царквы, касцёла і старажытных помнікаў архітэктуры, а ў наваколлі няма ўнікальных ці нават проста вядомых вытворчасцяў. Аднак ці не кожны з мясцовых жыхароў перакананы, што Чыжаха — населены пункт адметны. Прычым, пры пэўных умовах гэта вёска магла б аказацца «на слыху» ва ўсёй Еўропы.

АД ГАНЧАРОЎ ДА ДАЧНІКАЎ

Першы «афіцыйны» ўспамін пра Чыжаху звязаны з адкрыццём тракту Мінск—Ігумен—Бабруйск, ёсць дакладныя звесткі, што адна з паштовых станцый на тракце размясцілася якраз у цяперашняй вёсцы, і было гэта ў 1795 годзе. І ўсё ж адносна «малады ўзрост» трэба паставіць пад сумненне, бо ёсць іншая акалічнасць. Літаральна ў наваколлі Чыжахі знаходзіцца гарадзішча, прычым археалагічныя раскопкі і знаходкі рэштак посуду, слядоў пахаванняў, вельмі рэдкіх жалезных і бронзавых шпілек засведчылі — са старажытных часоў тут жылі людзі. А само гарадзішча на маляўнічым беразе Бярэзіны мясцовыя людзі дагэтуль так і завуць — Гарадком.

Не менш заблытаная справа і з назвай самой Чыжахі. Як быццам «паралелі» з вядомай птушкай выглядаюць даволі пераканаўча. Але паверыць тым, хто раіць «шукаць вытокі» па ўласным прозвішчы Чыж аднаго з колішніх тутэйшых ганчароўумельцаў, таксама можна. Вязкай, добрай гліны тут сапраўды шмат, месцамі ляжыць яна на ўзроўні нейкіх 20—30 сантыметраў ад паверхні глебы, так што «прабіць» звычайную свідравіну для вады — ужо праблема. Але праблема не меншая — адшукаць таго ж ганчара. Гэтага рамяства ў вёсцы ўжо няма. Затое Чыжаха дагэтуль славутая добрымі печнікамі, як і шмат стагоддзяў таму тут плятуць кашы, а яшчэ — робяць свае паясы. Магчыма, чыжахскія саматканкі і саступаюць слуцкім, аднак тое, што традыцыі захаваліся — факт ужо цікавы.

Так робяць пояс-саматканку.

— Хутчэй за ўсё, прычына ў тым, што нашы людзі ніколі не адрываліся ад зямлі і звыклых заняткаў, і сёння, калі ўсё можна купіць у краме, яны трымаюць шмат кароў, парсюкоў і курэй, многія маюць качак і гусей, а некаторыя — гадуюць трусоў і займаюцца пчалярствам, — заўважае жыхарка Чыжахі, работнік Багушэвіцкага сельвыканкама Таццяна Жукоўская. — А яшчэ чыжахцаў немагчыма ўявіць без лесу і рэчкі. Ці не кожны ходзіць па грыбы, большасць нарыхтоўвае і здае ягады, а сёй-той займаецца паляваннем. І нядзіўна: тых жа ласёў раз-пораз можна пабачыць літаральна на дарозе, каля вёскі спакойна гуляюць лісы, а дзікоў развялося столькі, што яны ператварыліся ў сапраўдную бяду — калі натрапяць на бульбяныя палеткі, то спыніць іх амаль немагчыма.

Аднак чарніцы, грыбы, рэчка, дзе трапляецца нават сом, і вялікая колькасць звяроў — адметнасці далёка не адзіныя. Ад Чыжахі да Беразіно амаль тры з паловай дзясяткі кіламетраў, і роўна такой жа будзе адлегласць да найбліжэйшага прамысловага прадпрыемства. Словам, па ўсіх «прыкметах» край цягне на «дачны», і ў гэтым плане папулярнасць вёскі сапраўды расце. Літаральна за два апошнія гады кошт жылля тут павялічыўся ці не ў чатыры разы, сёння за больш-менш прыстойную хату могуць папрасіць ужо 5-6 тысяч «умоўных адзінак», але пустых дамоў усё адно няма. Попыт відавочна перавышае прапанову, а адсюль — і планы па развіцці аграэкатурызму. Праўда, гаворка ідзе аб лічаных прыватных праектах, тым часам у пэўных варунках Чыжаха магла б стаць не менш «брэндавым» месцам, чым прыпяцкае Палессе ці Браслаўскія азёры.

СПАЧАТКУ БЫЛА ВЕРСІЯ...

Кажуць, што яшчэ ў пачатку 1980-х гадоў яе вылучыў матэматык і тагачасны кіраўнік раённага аддзела адукацыі Святаслаў Козел, які пралічыў: на самым ускрайку Бярэзінскага раёна знаходзіцца... геаграфічны цэнтр Еўропы. А больш дакладна, цэнтр трэба шукаць паміж вёскамі Чыжаха і Бычын.

— Безумоўна, адкрыццё зацікавіла ўсіх, але затым, як тое часта бывае, крыху пагаварылі — і забыліся, — узгадвае настаўнік хіміі і біялогіі Чыжахскай сярэдняй школы Віктар Гардзіеўскі. — І якое ж было здзіўленне, калі ў лютым 1999 года да нас прыехала прадстаўнічая дэлегацыя з Акадэміі навук, навукоўцы з картамі зайшлі ў найбліжэйшы лес, перайшлі ручай і паказалі: цэнтр Еўропы — тут. А потым усе зрабілі агульны здымак і вырашылі: неабходна збіраць грошы на ўсталяванне мемарыяльнага знака.

Неўзабаве на месцы, якое было вызначана як цэнтр кантынента, паўстаў звычайны камень-валун. Аднак мемарыяльнага знака тут няма і дагэтуль. Бо далей думка змянілася, сталі гучаць меркаванні, што «пункт» трэба шукаць не ў Чыжасе, узніклі варыянты Пухавіччыны, Глыбоччыны, Полацка, на асаблівы статус працягваюць прэтэндаваць у Заходняй Украіне, Літве, Польшчы, Славакіі. Вось толькі ў вёсцы гэтаму не вераць. І зазначаюць: «бярэзінскую» версію пацвярджае не адзін разлік, да таго ж навукоўцы, што прыязджалі са звышдакладнымі картамі («на іх было пазначана ці не кожнае дрэва і нават рэчкі, якія ўжо даўно не існуюць»), памыліцца не маглі. А што да прычын з'яўлення новых еўрапейскіх цэнтраў, то некаторыя нават лічаць: галоўную ролю адыгралі не столькі «матэматыка з геаграфіяй», колькі... больш развітая інфраструктура іншых рэгіёнаў. Чыжаха ж у гэтым плане саступае.

— Безумоўна, выключаць верагоднасць разыходжанняў нельга, у рэшце рэшт, важны сам пункт адліку, у прыватнасці, вядзецца той адлік толькі з самага паўночнага пункта мацерыковай часткі кантынента або з паўночных еўрапейскіх архіпелагаў і астравоў, — адзначае настаўніца гісторыі і нямецкай мовы Ларыса Галуза. — Але нам, нашым вучням і ўсім вяскоўцам вельмі крыўдна. Мы дагэтуль не згодныя з новымі меркаваннямі, мы верым, што цэнтр Еўропы знаходзіцца менавіта тут, а таксама спадзяёмся, што калі-небудзь гэта прызнаюць афіцыйна і да нас будуць ездзіць турысты.

ТРАНЗІТНЫ ВАРЫЯНТ

Сцвярджаць, нібыта Чыжаха паступова «памірае», адназначна нельга. Хаця адсюль пакрысе з'язджае моладзь, смяротнасць перавышае нараджальнасць, змяншаецца агульная колькасць насельніцтва. Але не так хутка. І сёння вёска налічвае пад восем дзясяткаў двароў, у ёй жыве больш чым дзве сотні чалавек, ёсць свае крама, аддзяленне сувязі, Дом культуры, сярэдняя школа. Да стратаў можна аднесці хіба што дзіцячы садок, але ён зачыніўся ўжо даволі даўно — недзе ў сярэдзіне 1990-х.

Пры гэтым яшчэ адна асаблівасць Чыжахі — вялікая доля працаздольнага насельніцтва і дзяцей. З улікам гэтага весці размовы аб «неперспектыўнасці» вёскі тым больш не выпадае. Але менавіта тут ёсць пытанні. Пасля шэрагу рэарганізацый, злучэнняў-далучэнняў навакольных сельгаспрадпрыемстваў стала цяжкавата з працай. Дадатковыя вакансіі, асабліва «падмацаваныя» прыстойнымі заробкамі, былі б далёка не лішнімі.

— Якраз таму мы перакананыя: будзе вельмі добра, калі сюды пачне прыязджаць як мага большая колькасць людзей — магчыма, яны адкрыюць для сябе гэтыя мясціны, чымсьці зацікавяцца і вырашаць укласці грошы ў стварэнне малога прадпрыемства, — адзначае старшыня Бярэзінскага райсавета Ірына Крывашэй. — Тым больш, што нягледзячы на аддаленасць ад райцэнтра, Чыжаха мае адзін істотны «плюс». Яна размешчаная каля трасы, што вядзе на Ялізава і Асіповічы, а ў сваю чаргу гэта — магчымасці транзіту і ўсе перавагі чыгункі.

Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.

Бярэзінскі раён.

Не ўпусціць магчымасць

«Удзел у выбарах можа дапамагчы ў распаўсюджванні беларускай мовы» — з гэтых слоў пачынаецца заява Сакратарыята Таварыства беларускай мовы, якая днямі з'явілася ў электронных СМІ.

У 1990 годзе, дваццаць гадоў таму, быў прыняты Закон «Аб мовах», а таксама адбыліся першыя дэмакратычныя выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы.

Тады ТБМ здолела вылучыць сотні кандыдатаў у дэпутаты ўсіх узроўняў. З іх у Вярхоўны Савет трапіла 13 чалавек, а ў мясцовыя Саветы дэпутатаў — аж некалькі сотняў (асабліва гэта датычыцца Мінска і некаторых іншых буйных гарадоў Беларусі). «Дзякуючы намаганням дэпутатаў пачаў рэалізоўвацца Закон «Аб мовах», — гаворыцца ў заяве.

У красавіку 2010 года адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы Беларусі. Папраўкі, унесеныя ў выбарчае заканадаўства, дазваляюць значна лягчэй, чым у мінулыя гады, вылучацца і рэгістравацца кандыдатамі ў дэпутаты. У сувязі з гэтым ТБМ заклікае прыхільнікаў роднай беларускай мовы прыняць самы актыўны ўдзел у выбарах.

«У вас ёсць унікальная магчымасць зрабіць свае праграмы па-беларуску, змясціць у іх патрабаванні аб стварэнні ў вашай выбарчай акрузе беларускамоўных школ і класаў, аб вяртанні гістарычных назваў нашым вуліцам і плошчам і ўшанаванні памяці нашых гістарычных герояў, навукоўцаў і асветнікаў», — звяртаецца Сакратарыят ТБМ да патэнцыйных кандыдатаў у дэпутаты. І нагадвае, што найлепш вылучацца шляхам збору подпісаў, бо гэта дае магчымасць пачаць кантактаваць з выбаршчыкамі па-беларуску значна раней.

Той, хто пераможа на выбарах, атрымае дзякуючы дэпутацкім паўнамоцтвам магчымасць чатыры гады адстойваць правы беларускамоўных грамадзян нашай краіны як на сесіях мясцовых Саветаў, так і ў штодзённым жыцці, гаворыцца ў заяве.

КАМПЕТЭНТНА

КААРДЫНАЦЫЯ Ў МЕЖАХ РАЗУМНАГА

На пытанні «МС» адказвае начальнік упраўлення па ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання Сакратарыята Савета Рэспублікі, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Аляксей СЦЕПАНЕНКА.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

— Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання быў створаны пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу тры гады таму. Якія задачы паставіла перад сабой новая структура, якія пытанні трапілі ў яе «поле зроку»?

— Самае галоўнае — гэта, безумоўна, каардынацыя дзейнасці ўсіх мясцовых Саветаў. Рэч у тым, што раней у нас не было структуры, якая займалася б такой каардынацыяй. У адпаведнасці з нашым заканадаўствам, Саветы ў сваёй дзейнасці з'яўляюцца незалежнымі. Вышэйстаячыя Саветы (базавыя ў адносінах да першасных, абласныя ў адносінах да базавых) аказвалі толькі арганізацыйна-метадычнае, канстытуцыйна-прававое садзейнічанне ў вырашэнні пытанняў, — і не больш за тое. Іх дзейнасць не была «замкнёная» на адной структуры. Ну а потым, у адпаведнасці з Указам № 21, быў створаны Савет па ўзаемадзеянні. Менавіта па ўзаемадзеянні — бо гаворка ідзе не пра кіраванне, а пра аказанне садзейнічання. Інакш кажучы, мы (я маю на ўвазе Савет па ўзаемадзеянні) падчас вырашэння тых ці іншых праблем павінны прадстаўляць і абараняць інтарэсы мясцовых Саветаў на рэспубліканскім узроўні.

Другі важны кірунак нашай работы — вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне цікавых напрацовак, так бы мовіць, перадавога вопыту. Усё ж Саветы ў нас працуюць парознаму. Нельга не заўважыць, што за апошнія гады з'явілася больш сістэмнасці, канкрэтыкі ў іх дзейнасці. Лепшыя напрацоўкі мы па крупіцах збіраем і імкнёмся даводзіць да ведама іншых Саветаў.

Забягаючы крыху наперад, скажу, што Савет па ўзаемадзеянні сапраўды адбыўся, ён стаў патрэбным і запатрабаваным — думаю, гэта адчулі і прадстаўнічыя органы на месцах.

— У вас склалася ўжо практыка правядзення выязных пасяджэнняў. Што гэта дае? Як фарміруюцца тэмы для абмеркавання?

— Савет па ўзаемадзеянні, па-першае, будуе працу ў адпаведнасці са сваім планам. І хоць усе сітуацыі, якія часам «падкідвае» жыццё, безумоўна, не прадугледзіш, але пэўныя накірункі мы ўсё ж вызначаем і бяром за аснову. Удакладню, што ўсе члены Савета па ўзаемадзеянні — а гэта старшыні абласных Саветаў дэпутатаў, шэраг старшыняў раённых і сельскіх Саветаў, прадстаўнікі органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — працуюць на грамадскіх пачатках (усяго 30 чалавек). Тэмы для абмеркавання, як правіла, прапануюць члены Савета і старшыні абласных Саветаў дэпутатаў. Сказаць, што мы вызначаем для выездаў нейкія «ўзорна-паказальныя» адрасы, было б няправільна. Хутчэй, арыентуемся на тыя тэрыторыі, сельсаветы, у якіх ёсць праблемы, характэрныя ў асноўным для многіх рэгіёнаў. І на іх прыкладзе спрабуем знайсці агульныя шляхі вырашэння.

Ну а чаму менавіта некуды выязджаем?.. Разумееце, сама падрыхтоўка да мерапрыемства ўжо нейкім чынам абавязвае мясцовыя ўлады наводзіць на тэрыторыі парадак. Гэта зусім не азначае, што яны кідаюцца, як у тым анекдоце, фарбаваць траву. Усё ў межах разумнага. Вы ж, напэўна, калі чакаеце прыходу гасцей, таксама стараецеся прыбраць у хаце?

Ды і, як кажуць, лепш адзін раз убачыць нешта на свае вочы, чым сем разоў пачуць. Выезд на месца — гэта магчымасць прамога кантактавання, непасрэдных зносінаў. І не толькі з кіраўнікамі раёна ці сельскага Савета, але і з дэпутатамі, і са звычайнымі грамадзянамі, якія пражываюць на гэтай тэрыторыі. Тут ужо цяжка, скажам так, пусціць пыл у вочы, прадэманстраваць выключна «фасад»... На мой погляд, такая форма работы дастаткова эфектыўная яшчэ і таму, што на дапушчаныя памылкі, недахопы ў рабоце кіраўнікам мясцовых Саветаў паказваюць іх жа калегі, а не вышэйстаячыя службовыя асобы. Каэфіцыент карыснага дзеяння такой крытыкі дастаткова высокі.

Хачу падкрэсліць, што падчас такіх выездаў асаблівая ўвага звяртаецца на забеспячэнне комплекснага, збалансаванага развіцця тэрыторыі. Можна ж, у прынцыпе, нядрэнна развівацца, але пры гэтым развівацца аднабакова. Між тым, ва Указе № 21 ёсць адзін пункт, на які не ўсе і не заўсёды звяртаюць увагу. Я маю на ўвазе неабходнасць рэгулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторый. У адпаведнасці з Канстытуцыяй, кожны грамадзянін, незалежна ад месца пражывання, мае гарантаванае права карыстацца шэрагам дабротаў. А ў нас узроўні развіцця тэрыторый дзе-нідзе розныя, і не заўсёды гэтыя даброты прадстаўлены аднолькава і ў належным выглядзе. Так што нашы наведванні дапамагаюць вызначыць, якія кірункі на месцах развіваюцца лепш, а дзе адбываецца адставанне.

У рэшце рэшт, і выязныя пасяджэнні, і работа па іх падрыхтоўцы, і сустрэчы ў рэгіёнах падпарадкаваны адной задачы: вывучэнню праблем глыбінкі і іх абагульненню — з далейшым выхадам на органы дзяржаўнага кіравання для іх рашэння.

— У такім разе, якія праблемы ўдалося вырашыць Савету па ўзаемадзеянні за час свайго існавання?

— Тут можна шмат гаварыць, але прывяду толькі апошнія прыклады. У пачатку мінулага года старшыня Савета па ўзаемадзеянні Барыс Васільевіч Батура праводзіў сустрэчу са старшынямі сельскіх Саветаў. Удзельнікі сустрэчы спыталі: чаму, нягледзячы на невялікую колькасць штатных супрацоўнікаў сельвыканкама, яны па-ранейшаму вымушаны займацца зборам падаткаў ад насельніцтва (маюцца на ўвазе падаткі на нерухомасць і на зямлю)?

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Здзітаўскі стараста

Здзітава можа шмат чым здзівіць. Як, напрыклад, аднойчы летам здзівіла прыезджага госця... адсутнасцю бур'яну. У раёне праходзіў семінар па пытаннях мясцовага самакіравання. І адзін з магілёўскіх калегаў тутэйшага старшыні сельскага Савета Галіны Акуліч пажадаў наведаць менавіта гэту вёску, якая ніколі не мела капіталаўкладанняў аграгарадка альбо іншага ўзорна-паказальнага населенага пункта. Чалавек той быў спрактыкаваны спецыяліст, таму папрасіў правезці яго не толькі па цэнтральнай вуліцы, але і закавулкамі, агародамі. І шчыра здзіўляўся потым, што нідзе, нават за хлявамі, не ўбачыў бур'яну, крапівы ды іншага пустазелля.

У Здзітаве з насельніцтвам 224 чалавекі няма праблемных сем'яў, дзе дзеці церпяць ад пітушчых бацькоў, няма пустых дамоў. А вось гісторыя ў Здзітава багатая. Аднайменны маёнтак згадваецца ў шматлікіх дакументах Вялікага Княства Літоўскага. У сярэдзіне XVIII стагоддзя яго арандаваў Людвік Касцюшка, бацька знакамітага Тадэвуша Касцюшкі. У першай палове XIX стагоддзя Здзітава належала панам Скаўронскім.

Але галоўнай славутасцю вёскі была і застаецца Свята-Мікіцкая царква, вядомая з 1502 года. Драўляны храм, пабудаваны без адзінага цвіка, перажыў усе войны і дастаяў да нашых дзён. Зразумела, што здзітаўцы ганарацца такім помнікам. Стараста вёскі Аляксандр Батуля, ён жа вадзіцель раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, расказаў, як летась уласнаручна ацаніў будаўнічае майстэрства продкаў.

У паддашку царквы, недзе паміж столлю і падлогай паддашка, завяліся восы. Абсталявалі даволі вялікае гняздо і паводзілі сябе не сказаць, каб міралюбіва. Пакусалі некалькі прыхаджан. Святар паклікаў Аляксандра. Ён як стараста, а галоўным чынам як выратавальнік палічыў сябе абавязаным зрабіць тэрміновыя захады. І, прыхапіўшы інструменты, палез наверх, каб выгнаць няпрошаных гасцей. Там стала зразумела, што патрэбна аддзерці хаця б дзве дошкі. Дык вось гэтая простая справа, на якую ў сучаснай пабудове спатрэбілася б не болей за пяць хвілін, заняла добрую гадзіну. Думаў, ужо і не здолее падступіцца з манціроўкай да дошкі, якую старадаўні будаўнік замацаваў драўляным трымальнікам. Але ж неяк тую дошку выдраў і насякомых выкурыў.

Старасту непакояць і дубы вакол царквы. Ім, пэўна, не меней гадоў, чым храму. І выглядаюць яны надзвычай велічна. Але адно дрэва ўжо павалілася ад старасці. Другое стаіць дзесяцігоддзі без лістоў, нежывое. Даводзіцца пілаваць аграмадныя галіны, якія прызнаны аварыйнымі.

Кожны дзень прыносіць старасту вёскі новыя клопаты. Асабліва цяпер, калі вуліцы і дарогі літаральна патанаюць у снезе. Толькі мы з Аляксандрам Вітальевічам пад'ехалі да галоўнай вясковай славутасці — царквы, як першы сустрэчны чалавек адразу да яго з праблемай: «Саша, трэба дарогу да могілак расчысціць, а то, не дай Бог, спатрэбіцца, нават да варотаў не пад'едзеш». Тут ужо ўключылася ў размову старшыня сельскага Савета: «Калі гэты пад'езд спатрэбіцца, то трактар прыйдзе адразу ж, не хвалюйцеся». Разгаварыліся. Вяскоўцы ўзгадалі, што сёлета могілкі былі прыведзены ў парадак, а вакол пастаўлена новая агароджа. І, як заўсёды, галоўным арганізатарам работы стаў стараста.

Абралі яго на агульным сходзе ў 1999 годзе, прыкладна тады ж Аляксандр Батуля стаў дэпутатам сельскага Савета. І выконвае свае абавязкі ўжо тры скліканні. Грамадскую работу заўсёды ўспрымаў як асаблівы давер аднавяскоўцаў. Дзесяцігоддзе таму ў вёсцы Здзітава — першай у Жабінкаўскім сельсавеце — правялі эксперымент (тады экперымент!) па цэнтралізаваным вывазе бытавых адходаў. Цяпер паслугай карыстаецца 100 працэнтаў жыхароў вёскі. А ў той час... стараста хадзіў ад двара да двара, гутарыў, пераконваў, даводзіў на прыкладах і разліках. Спачатку запісаліся асобныя гаспадары, за імі суседзі, потым іншыя. Цяпер праблемы смецця ў вёсцы практычна не існуе. А стыхійныя звалкі ў прамым сэнсе прывозяць на машынах нядбайныя гараджане. Райцэнтр — побач. Іншы на хаду з машыны выкіне мех смецця, і паімчаў далей. А мясцовым даводзіцца прыбіраць. Старшыня сельскага Савета расказвала, як аднойчы за такім «гастралёрам» некалькі кіламетраў гналася, каб нумар запісаць. Але ж дзе ты на «Жыгулях» іншамарку дагоніш? Таму праблема навядзення парадку на тэрыторыі, падобная на тое, вечная.

А вось тэлефанізацыю атрымалася правесці яшчэ падчас першага дэпутацкага склікання новага старасты. Сваіх землякоў Аляксандр Батуля лічыць людзьмі разважлівымі, са сталай грамадзянскай пазіцыяй. Сведчаннем таму газаправод, які цягнулі ўскладчыну, талакой. Цяпер такім жа чынам будуецца водаправод. Правільней сказаць, яго працягнулі ў вёску яшчэ ў 2008 годзе. Цяпер дакладаюцца асобныя «ніткі»: да агульнай справы падключаецца нехта з навасёлаў ці з тых, хто раней не адважыўся. Людзі ўжо ацанілі гарадскія выгоды і вельмі задаволеныя новымі зручнасцямі. А рабілі гэту справу паступова, з індывідуальным падыходам да кожнага. Калі хто са старых адзінокіх людзей не мог адразу ўнесці патрэбную суму, яе «раскідвалі» на некалькі месяцаў. І ўсе неабходныя трубы праклалі. А ў цэнтры вёскі, да асаблівага гонару старасты, усталявалі пажарны гідрант.

У размове нагадала Аляксандру Батулі пра інфармацыю на сайце абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях аб тым, што ў вёсцы за апошнія дзесяць гадоў здарыўся толькі адзін пажар. «Гэта не мая заслуга, — адразу запярэчыў стараста, — гэта найперш заслуга газіфікацыі. Печаў няма, адсутнічае асноўны зімовы фактар рызыкі». Але потым усё ж узгадаў, што сходы на супрацьпажарную тэматыку ў вёсцы праводзяцца рэгулярна. І тых, хто аціпляе сваю хату па-ранейшаму, ён перыядычна наведвае.

Увогуле, сход паступова стаў адной са зручнай формаў работы здзітаўскага старасты. Ён прыйшоў да высновы, што такім чынам больш рацыянальна выкарыстоўваецца час, ды і людзі атрымліваюць поўную інфармацыю. Кожны задае сваё пытанне, бывае, завязваецца нейкая дыскусія... Індывідуальных стасункаў таксама хапае. У вёсцы ж з многімі бачышся кожны дзень.

За час работы аўтару гэтых радкоў даводзілася сустракацца з нефармальнымі, неабыякавымі старастамі вёсак. Але найчасцей гэта былі людзі старэйшага ўзросту, звычайна пенсіянеры, якіх ведаюць, паважаюць і ў якіх больш вольнага часу. А тут старастам абралі чалавека ў 32 гады, і па ўсім відаць, работа за дзесяць гадоў для яго не стала цяжарам. Аляксандр нарадзіўся і вырас тут. Тут жылі бацькі і дзяды. Калі мы выязджалі з вёскі, стараста між іншым паказаў свой дом. Адна палавіна будынка атынкавана і пафарбавана на сучасны манер, а другая засталася, як была, са старой цэглай зверху. Цэгла гэта звяртае на сябе ўвагу — асаблівая, старадаўняя. Аказалася, дом будаваў яшчэ дзед бабулі Аляксандра, які быў заможным чалавекам. Аляксандр знайшоў у архіве дакумент на дом 1906 года. Тая папера толькі пацвярджала ўласнасць, а вось дата будаўніцтва пакуль застаецца невядомай.

Так што мясцовы стараста мае ў сваёй вёсцы вельмі глыбокія карані. І яго неабыякавае стаўленне да родных мясцінаў, мабыць, недзе запраграмавана. Таму выглядае цалкам лагічна, што па выніках работы за мінулы год раённы Савет прызнаў яго лепшым старастам раёна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Жабінкаўскі раён.

На здымку: стараста **Аляксандр БАТУЛЯ** (злева), старшыня сельскага Савета **Галіна АКУЛІЧ** (справа) з жыхарамі вёскі Здзітава.

«СКАЖЫЦЕ, МАМА НЕ ЗВАНІЛА?»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Дзякуючы агульным намаганням, жанчыны палепшылі свае жыллёвыя ўмовы, зрабілі печ, нарыхтавалі дровы. А потым маладая маці знайшла сабе сужыцеля, які вярнуўся з месцаў пазбаўлення волі. Яны перасяліліся ў хату, што засталася яму ў спадчыну, а там не было належных бытавых умоў для пражывання малога (нават сістэма аціплення няспраўная). У выніку дзіця, якому тады было 3,5 гадзіка, засталося без догляду. Сітуацыя рэзка пагоршылася, і дзяржаўныя службы вымушаны былі ў тэрміновым парадку забраць дзіця. Сёння малы знаходзіцца ў прытулку, а органы апекі рыхтуюць дакументы для перадачы ў суд на пазбаўленне маці яе правоў на дзіця.

— Ёсць у нас катэгорыя праблемных бацькоў, якія скончылі не агульнаадукацыйную школу, а спецшколу (і гэта якраз такі выпадак), — расказала Валянціна Каваленка. — З такімі найбольш складана. Выпівоху можна закадзіраваць, да яго можна «дастукацца» — не адным, дык іншым спосабам. А такім людзям цяжка нешта патлумачыць. Ім можна паказаць, як і што трэба рабіць, але калі ў іх з'яўляецца новы аўтарытэт (напрыклад, сужыцель), клопат пра дзіця выцясняецца новым жыццёвым прыярытэтам.

Паводле слоў Валянціны Уладзіміраўны, у горадзе няўдаласць сям'і больш завуаляваная, чым у сельскай мясцовасці. У вёсцы людзі больш шчыльна кантактуюць, там кожны навідавоку. А ў горадзе крыху больш складаная сітуацыя, там у кожнага свая кватэра, часам суседзі нават не бачаць адзін аднаго. Знешне такія бацькі імкнуцца выглядаць нармальна, дастойна, у грамадскіх месцах паводзяць сябе адэкватна, а дома, за зачыненымі дзвярыма, выпіваюць.

— Дапамогу ў раннім выяўленні няўдалых сем'яў у горадзе нам аказвае міліцыя. Яны выязджаюць на сямейныя скандалы, і калі ў гэтай сям'і ёсць няпоўнагадовыя, адразу нас інфармуюць. Потым ужо мы вывучаем становішча ў сям'і. Бываюць выпадкі, што гэтая сям'я ў нас раней не разглядалася як няўдалая. Потым, зразумела, да такіх бацькоў вельмі пільная ўвага. У нас былі літаральна адзінкавыя выпадкі, калі мы прызнавалі такую сям'ю СНС. Гарадское ЖКГ дасылае нам спісы неплацельшчыкаў, што таксама дапамагае выяўляць няўдалыя сем'і.

Галоўным фактарам эфектыўнасці Дэкрэта № 18 Валянціна Каваленка лічыць зладжанасць работы ўсіх задзейнічаных у яго рэалізацыі структур.

— Асноўнае — размеркаваць, хто чым павінен займацца, і потым перыядычна адсочваць вынікі работы. Кіраўніцтва і кантроль дадуць свае станоўчыя вынікі. Хочацца яшчэ адзначыць, што ў нас высокая аператыўнасць праводзімай па рэалізацыі Дэкрэта №18 работы, што таксама станоўча адбіваецца на выніках.

Наша самая галоўная задача — зрабіць усё магчымае для захавання дзіцяці ў біялагічнай сям'і, а калі не атрымаецца — знайсці замяшчальную. Па маім глыбокім перакананні, дзеці павінны жыць ТОЛЬКІ ў сям'і. Прывяду такі прыклад. У нас на уліку стаяла маладая жанчына, якая ў свой час выхоўвалася ў інтэрнаце — пры жывой маці. І потым, калі нарадзіла сама, не змагла забяспечыць малому належныя ўмовы пражывання. Мы яе дзіця год трымалі ў прытулку (два тэрміны!), хацелі даць маці шанц адумацца. Хлопчык, якому тады было 10 гадоў, кожны раз, калі я прыходзіла ў прытулак, пытаўся ў мяне: «Скажыце, мама не званіла?» А мама не званіла, яна проста не разумела, што значыць клапаціцца пра сваё дзіця... Усе дзеткі, якія трапляюць у прытулак, хочуць нармальную сям'ю, кожны з іх марыць пра тое, што ў яго з'явіцца тата і мама, якія будуць яго любіць.

Бывае, што з прытулку дзеткі адпраўляюцца ў новую сям'ю, якая іх усынавіла. Апошні прыклад: днямі райвыканкам прыняў рашэнне аб стварэнні прыёмнай сям'і, у якую перадалі двух братоў (1999 і 2000 гадоў нараджэння). Хлопчыкі ў прытулак патрапілі паўторна, кожны раз — па прычыне запояў маці. Свой шанц на захаванне сям'і яна не выкарыстала, і дзеткі атрымалі новых бацькоў.

— Гэта ўжо 39-я прыёмная сям'я ў нашым раёне, — працягвае Валянціна Каваленка. — Многія з тых, каго ўсынавілі, не хочуць цікавіцца сваімі біялагічнымі бацькамі. Новыя бацькі расказваюць, што напачатку такія дзеткі не могуць ад'есціся. Пастаянна адкрываюць халадзільнік і правяраюць, ці ёсць у запасе прадукты, бо баяцца застацца галоднымі. Паверце, на гэта без слёзаў глядзець немагчыма. У прытулку дастатковае 5-разовае харчаванне, але сапраўдная хатняя ежа для іх вельмі важная. Таму вяртацца туды, адкуль іх забралі, дзеці не хочуць.

Увогуле, мы не забараняем біялагічным бацькам бачыцца са сваімі дзецьмі, пры ўмове, што яны ўсвядомілі сваю віну і прыязджаюць да дзяцей цвярозымі. У іх ёсць магчымасць аднавіцца ў бацькоўскіх правах. І гэты шанц варта выкарыстаць. Калі ёсць такое жаданне — мы абавязкова дапаможам.У нас ёсць прыклады, калі сям'я (муж і жонка) аднавіліся ў бацькоўскіх правах. Праўда, пакуль яны да гэтага прыйшлі, старэйшае дзіця выросла, таму ў сям'ю вярнуўся толькі малодшы сын. Старэйшая дачка выйшла замуж і, па яе ўласных словах, самым лепшым падарункам на вяселле было тое, што мама не піла.

Падсумоўваючы тэму Дэкрэта № 18, Валянціна Уладзіміраўна падкрэсліла, што азначаны дакумент дзейсны ўжо таму, што прымушае ўсіх звярнуць увагу на праблемныя сем'і.

— Проста мне пашанцавала з жонкай. Я не толькі ў свой час адбіў ва ўсяго курса самую прыгожую дзяўчыну. Але гэтая дзяўчына аказалася цудоўнай жонкай і маці. Пры тым, што яна, як і я, архітэктар, і ўсё жыццё працавала. І цяпер працягвае працаваць.

— Значыць, гэта цалкам магчыма: і самарэалізавацца, як цяпер любяць казаць, і сям'ю захаваць?

— Я думаю, што гэта нават дапамагае адно аднаму. У нас усё агульнае, мы ў курсе спраў адно аднаго, усё абмяркоўваем, і гэта дае нам сілы.

— А ў якой сферы знайшлі сябе вашы дзеці?

— Мой старэйшы сын фізік, ён працаваў у Мінску ў канструктарскім бюро на заводзе імя Вавілава. Потым яго накіравалі ў аспірантуру ў Ленінград. Там ён ажаніўся, там і застаўся. Малодшы — мастак. Скончыў нашу Акадэмію мастацтваў, потым паехаў на стажыроўку ў Германію і раптам паступіў у Мюнстэрскую мастацкую акадэмію, скончыў і застаўся там працаваць. Ён грамадзянін Беларусі, але жыве ў Германіі. Ён піша гарадскія пейзажы. Яго выстава была і тут, у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, калі адзначалася 100 гадоў маёй маці. Цяпер работы сына ёсць на выставе, прысвечанай Васілю Сумараву, сын быў яго вучнем.

Работа

— Вальмен Мікалаевіч, напярэдадні юбілею найперш хочацца спытаць вас пра... планы.

— Планы ў мяне грандыёзныя. Па-першае, я працягваю выкладаць. Акрамя таго, я ўвесь час займаюся навукай. Мы заключылі дагавор з Інстытутам энергетыкі Акадэміі навук Беларусі, і ў найбліжэйшыя тры гады будзе весціся вельмі вялікая, і на мой погляд, унікальная, работа. Наша навуковая група разам з некалькімі іншымі арганізацыямі будзе распрацоўваць архітэктурныя аспекты энергазберажэння.

Але галоўныя мае планы датычацца праектавання. Я хачу рэалізаваць ідэю новай стылістыкі ў архітэктуры. Цяпер уся Еўропа на чале з Амерыкай працягвае той стылевы кірунак, які ўзнік на пачатку мінулага стагоддзя, і які, не толькі на мой погляд, зайшоў ужо ў тупік. Сучасная архітэктура — гэта ўжо не архітэктура высокага мастацтва, а архітэктура эпатажу. Сёння архітэктары імкнуцца ў першую чаргу здзівіць. Ім не важна — прыгожа гэта альбо не.

Маё крэда: архітэктура павінна быць прыгожай. Дарэчы, медыкі высветлілі, што вялізныя аднолькавыя плоскасці, бясконцы паўтор аднолькавых элементаў негатыўна ўздзейнічаюць на наша здароўе. Вока гэта не ўспрымае: не толькі зрок пагаршаецца, але і ў мозг трапляе неадэкватны сігнал, у выніку псуецца нервовая сістэма.

У старой архітэктуры прыгожыя дэталі, наадварот, дзейнічаюць на чалавечую псіхіку дабратворна. Прыгожа — гэта значыць карысна для здароўя.

Паглядзіце, чалавек за ўвесь час свайго існавання на Зямлі прынцыпова не змяніўся. Уся сістэма чалавечага ўспрымання, прыстасаваная да пэўных маштабаў, колераў, прапорцый, засталася ранейшай. Як вы думаеце, чаму прапорцыя залатога сячэння лічыцца прыгожай? Таму што чалавек сам пабудаваны па гэтым прынцыпе. Мы самі сабе падабаемся...

— І мераем сабой прыгажосць?

— Чалавек і ёсць мерка прыгажосці! А чым можна памераць хмарачос вышынёй у 800 метраў? Мне падабаюцца маскоўскія вышыннікі. Яны адпавядаюць памерам горада і маюць выразны сілуэт, які ў нечым паўтарае традыцыйныя форм рускай архітэктуры. А проста ў вялізных каробках ніякай асаблівасці няма.

У маім жыцці было некалькі выпадкаў, калі я браўся за тое, пра што не ведаў, як гэта рабіць. Менавіта яны стварылі мне славу авантурыста. Але насамрэч гэтыя сітуацыі былі вымушаныя.

Я хачу стварыць такую архітэктуру, якая спалучала б апошнія тэхнічныя і тэхналагічныя дасягненні з прынцыпамі класічнай архітэктуры. Хачу вярнуць архітэктуры прыгажосць. Каб позірк не слізгаў па будынку, а спыняўся на ім і атрымліваў асалоду.

Разам з маім таленавітым вучнем і калегам Алегам Валовічам мы робім праект для забудовы ўчастка на вуліцы Мельнікайтэ побач з галоўным офісам кампаніі «Velcom». Вялікі 35-павярховы дом па нашым праекце будзе пабудаваны таксама на рагу вуліц Маякоўскага і Дзяніса Аўскай, на месцы гаражоў, якія будуць знесеныя. Абодва праекты выконваюцца цалкам у новай архітэктуры.

— Наколькі лёгка спалучыць новыя тэхналогіі і матэрыялы з класічным уяўленнем пра прыгажосць?

— Лёгка нічога не бывае. І што такое складана, я не ведаю. Пра спалучэнне новага і прыгожага я думаў шмат гадоў. І ўсе мае праекты зробленыя ў гэтым ключы. Камароўскі рынак мае цалкам сучасную форму, але пры гэтым зыходзіць ад эстэтычнага пачатку. У Раўбічах пабудаваны сучасны будынак гасцініцы і амаль канструктывісцкі судзейскі павільён, усё гэта не толькі ўпісана ў ландшафт, але і мае рысы беларускай традыцыйнай архітэктуры.

Сёння праблема прыгажосці ў архітэктуры наспела, таму ў маіх планах паспець рэалізаваць як мага больш.

Шлях

— Значыць, вы зноў на пачатку шляху?

— Я ў 50 гадоў пачаў новую кар'еру — выкладчыка. Цяпер вярнуўся да інтэнсіўнага праектавання.

— А што было ў 50?

— Памёр Пётр Міронавіч Машэраў, і мае ворагі да мяне дабраліся.

— Наколькі цяжкім іспытам быў выхад з пасады дырэктара інстытута «Белгіпрагандаль» тады, і як падзелі 30-гадовай даўніны ўспрымаюцца цяпер?

— Напэўна, я ўсё адно зышоў бы на выкладчыцкую працу... Але сутнасць у тым, што Інстытут «Белгіпрагандаль» я сам прыдумаў, з нуля яго стварыў і давёў да канцыцыі, калі ён стаў у шэраг першакласных праектных беларускіх інстытутаў. А ў сваёй галіне ён быў самым буйным у Саюзе. Інстытут праектаваў не толькі аб'екты гандлю: было вядома, што наш інстытут можа рабіць усё.

Разам з тым, такі асаблівы інстытут быў неабходны. Дзякуючы яму ў Мінску з'явіліся ўніверсамы і гандлёвыя цэнтры. Гэта была свайго роду рэвалюцыя, бо да таго часу крамы былі, як правіла, убудаваныя.

— Што з інстытутам цяпер?

— Ён па-ранейшаму належыць Міністэрству гандлю, але ён гэтаму міністэрству не патрэбны. Па-першае, Міністэрства гандлю сёння нічога не будуе. Па-другое, яно ніяк не ўплывае на будаўніцтва. Інстытут «Белгіпрагандаль» сёння спустошаны: у яго адабраны будынак, з яго сышлі таленавітыя спецыялісты. Я прапанаваў міністру перадаць гэты інстытут у Беларускі акадэмічны цэнтр Міжнароднай акадэміі архітэктуры. Спадзяваўся прывесці яго ў парадак і перадаць у Акадэмію навук, а на яго базе стварыць навукова-даследчы інстытут. Нядаўна атрымаў адказ: нам самім патрэбны інстытут, мы будзем шукаць яму новыя функцыі. Якія новыя функцыі? У яго адна функцыя — праектаванне. Я не ведаю, удасца інстытут выратаваць, ці яны давядуць яго да банкруцтва.

Напэўна, нейкія пазнавальныя традыцыйныя моманты ў архітэктуры павінны быць. Але важна, каб быў нейкі дух, які прымушае казаць з захапленнем: «Такое, браты, я толькі ў Беларусі бачыў!»

Назіранні

— Наколькі сёння магчыма стварыць новы праектны інстытут?

— Баюся, што сёння гэта нерэальна. Па-першае, у нас востры дэфіцыт праекціроўшчыкаў. Архітэктараў мы выпускаем дастаткова, але тут іншая праблема. Сёння на архітэктурным факультэце вучыцца толькі 15—20 працэнтаў хлопцаў. Я не хачу сказаць, што дзяўчаты да гэтай прафесіі не здольныя, яны цудоўна працуюць «ля дошкі». Але для архітэктара гэтага недастаткова. Праект павінен быць разлізаваны. Для гэтага трэба ўмець абараніць яго на савеце, які складаецца, дарэчы, у асноўным з мужчын. А потым трэба ўмець працаваць на будаўнічай пляцоўцы, кантактаваць з будаўнікамі, размаўляць на іх мове. Можа адзін працэнт з усіх дзяўчат-выпускніц і зможа потым усё гэта рабіць і лаяцца матам. Але гэта — не жаночая справа. Як не жаночая справа кіраваць цяжкімі грузавікамі. Таму ў мяне ёсць асцярога, што наша архітэктурная школа праз пэўны час можа скончыцца.

Некаторыя прафесіі ў гэтай сферы ўвогуле настолькі дэфіцытныя, што я не ведаю, што будзе далей. Таму стварыць новы інстытут мне не ўяўляецца магчымым.

Але ж ёсць гатовы інстытут, які яшчэ можна захаваць, умацаваць. Я бяруся зрабіць гэта і не прашу грошай. Інстытут мог бы захаваць свой профіль, у ім засталіся б працаваць тэхнолагі, але разам з тым ён займаўся б даследчай працай і праектаваў для Акадэміі навук.

— Вы ўзгадалі пра беларускую архітэктурную школу. Што стаіць за гэтым выразам?

— Я прыехаў сюды ў 1953 годзе. Архітэктараў тады тут было ну можа не больш за 25. Усе яны вучыліся ў школах Масквы, Ленінграда, Кіева, Львова, Новасібірска. І толькі ў 1952 годзе Аляксандр Воінаў дабіўся, каб у нас арганізавалі архітэктурнае аддзяленне. Мая жонка з ліку першага выпуску гэтага аддзялення. Гэта і стала пачаткам стварэння беларускай архітэктурнай школы. Сёння яна забяспечвае кадрамі ўсю Беларусь, і не толькі.

Акрамя таго, вельмі важна, што складаюць яе ў большасці людзі, якія нарадзіліся і выраслі ў Беларусі. Ёсць рэчы ў нашых традыцыях, у менталітэце, якія цяжка зразумець чалавеку прыезджаму, а тым больш увасобіць гэта ў архітэктуры.

— Якія асаблівыя рысы ўласцівыя беларускай архітэктуры?

— Я яшчэ не гатовы цалкам сфармуляваць адказ на гэтае пытанне, хоць і думаў над ім.

Давайце возьмем праспект Незалежнасці ў Мінску. Праектавалі яго пад кіраўніцтвам маскоўскага архітэктара Міхала Парушнікава. Але Парушнікаў, дарэчы, быў любімым вучнем пінскага шляхціча Івана Жалтоўскага. У выніку ў нас ёсць праспект, выкананы ў стылі класіцызму, але не падобны ні на адзін іншы ў свеце.

— Беларуская зямля прадыктавала нешта таямнічае?

— Ва ўсякім разе, гэта асабліва стала беларускім. Нехта сказаў: зрабі, каб было ні на што не падобным і хораша, і ты атрымаеш беларускае. Але нешта рабілася наўмысна. Напрыклад, Георгій Заборскі ўводзіў элементы арнаменту, прычым вядома, што ён браў іх з посцілак. Гэта можна ўбачыць на ўваходзе ў Парк імя Горкага, на мануменце Перамогі на аднайменнай плошчы. Яго выдатныя дамы на вуліцы Леніна не маюць такой прамой цытаты, але ў раслінным арнаменце на іх ёсць матыў слуцкага пояса.

Калі я рабіў у Раўбічах нахільныя плоскасці — такія своеасаблівыя дахі, з аднаго боку, адштурхоўваўся ад цірольскіх матываў: там горы і тут горы. Але больш абапіраўся на народную архітэктуру, на сілуэт хаты. А сцены прыбудовы да гасцініцы я абліцаваў валунамі, падобна да таго, як абліцаваная Свята-Пакроўская царква ў вёсцы Турэц Капэліцкага раёна.

Напэўна, нейкія пазнавальныя традыцыйныя моманты ў архітэктуры павінны быць. Але важна, каб быў нейкі дух, які прымушае казаць з захапленнем: «Такое, браты, я толькі ў Беларусі бачыў!»

Дык вось, я хачу стварыць такую архітэктуру, якая спалучала б апошнія тэхнічныя і тэхналагічныя дасягненні з прынцыпамі класічнай архітэктуры. Хачу вярнуць архітэктуры прыгажосць. Каб позірк не слізгаў па будынку, а спыняўся на ім і атрымліваў асалоду.

Учынкі

— Вы вядомы як чалавек смелы, некаторыя кажуць — авантурны. Якімі авантурамі ў сваім жыцці вы ганарыцеся?

— У сваім жыцці я кіруюся трыма прынцыпамі. Першы — калі нехта гэта зрабіў, значыць і я змагу. Другі — рашэнні трэба прымаць хутка. І трэці — пачатае трэба даводзіць да канца. У маім жыцці было некалькі выпадкаў, калі я браўся за тое, пра што не ведаў, як гэта рабіць. Менавіта яны стварылі мне славу авантурыста. Але насамрэч гэтыя сітуацыі былі вымушаныя.

Напрыклад, калі трэба было за два месяцы да адкрыцця міжнароднай выставы ў Лейпцыгу зрабіць праект беларускай экспазіцыі на вялізнай плошчы, я ведаў, што гэта патрэбна інстытуту «Белгіпрагандаль» — каб заваяваць імя. Таму і ўзяўся. Вядома ж, гэта не значыць, што я ўсё зрабіў сам. Але знайшоў спосаб, як гэта зрабіць. Знайшоў у Маскве пры Гандлёвай палаце мастака, пад кіраўніцтвам якога мы за месяц стварылі цудоўны праект. Потым, бясспрэчна, давялося пакруціцца і нам, і ўсім міністрам, але мы ўсё паспелі.

Праектаванне Раўбічаў было цалкам авантурай. Але таксама вымушанай. Праўда, я тады дабіўся, каб мне дазволілі праект ні з кім не ўзгадняць. Спраектаваць і пабудаваць аб'ект трэба было за год! Параўнайце: зараз я працую над аб'ектам, дзе год пайшоў толькі на ўзгадненне ўчастка! Калі б мы сёння выключылі ўсю нашу дзікунскую бюракратыю пры разглядзе праектаў, мы будаваліся б у пяць разоў хутчэй.

Раўбічы праектаваліся і будаваліся ў экстрэмальных умовах. Напрыклад, я маляваў алоўкам судзейскі дамок з 12-метровымі кансолямі, ставіў памеры і аддаваў адразу рабіць фундаменты. Па сённяшнім часе гэта проста фантастыка. Мне надзвычай пашанцавала з будаўнікамі — 5-ае ўпраўленне 1-га трэста. Брыгадзір муляраў у мяне быў Герой Сацыялістычнай Працы. Без гэтых людзей нічога, безумоўна, не атрымалася б.

— У асабістым жыцці былі авантуры?

— Усё жыццё — суцэльная авантура.

Успаміны

— Вальмен Мікалаевіч, ваш бацька, Мікалай Ільіч, вядомы кампазітар. Маці, Алена Васільеўна, падзвіжніца, з імем якой звязана аднаўленне згубленай у гады Вялікай Айчыннай вайны калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея. Яна ўсё сваё жыццё прысвяціла гэтай справе, аднак многае вярнуць так і не ўдалося. Можа, у коле сям'і былі агучаныя нейкія версіі, публічна агучыць якія тады не было магчымасці?

— Многія рэчы былі, вядома ж, разрабаваныя. Некаторыя карціны мінчане разабралі па дамах. Потым, пасля вайны, вярнулі. Але самыя каштоўныя творы, у прыватнасці, Слуцкія паясы, былі вывезеныя, як меркавала маці, у гітлераўскую альбо гебельсаўскую прыватную калекцыю. Недзе яны ёсць. Яны не загінулі. Бо будынак музея застаўся цэлы. І ўсе каштоўнасці ў ім былі падрыхтаваныя да вывазу. Я сам бачыў, як маці складвала ў вялізную скрыню Слуцкія паясы 24 чэрвеня 1941 года.

— Раскажыце больш падрабязна.

— Раніцай 24 чэрвеня бацькі, як звычайна, адправіліся на працу. Бацьку трэба было экзамены прымаць у кансерваторыі. З-за таго, што ўсё ж такі пачалася вайна і нейкія дробныя бамбёжкі ўжо былі, яны ўзялі мяне з братам з сабой. Мы дайшлі да вуліцы Карла Маркса. Пачалася трывога. Гэта было каля будынка, дзе цяпер знаходзіцца музей пошты. Мы зайшлі туды ў бамбасховішча. Пачалася самая разбуральная бамбёжка Мінска. Маці кінулася ў музей рыхтаваць маёмасць да вывазу. Да вайны яна працавала там галоўным захоўнікам. Я памятаю, як скалачвалі скрыні, як складваліся ў іх карціны, асабліва запомніў, як маці складвала Слуцкія паясы. Яна вельмі клапацілася пра іх яшчэ і таму, што сама вывезла іх у 1939-м з Нясвіжа. Яшчэ памятаю, як звалі ў розныя ўстановы. Да глыбокай ночы ўся маёмасць была падрыхтаваная. Але яе ніхто не вывез.

Астатак ночы мы правялі ў бамбасховішчы. Раніцай выйшлі і ўбачылі, што ўвесь Мінск гарыць. Гэта было 25 чэрвеня. На вуліцы ляжалі абгарэлыя людзі. Але ў маю дзіцячую памяць чамусьці ўрэзалася абгарэлая свіння. Калі мы прыйшлі дадому, то ўбачылі толькі коміны, попел і тры дэкі — адна ад раяля і дзве ад піяніна. І дзве сабачкі ў нас было, яны загінулі.

Вось так мы і пайшлі. У бацькі быў партфель у руцэ, у маці — нічога. З Мінска да магілёўскіх Горак мы ішлі пешшу. Абутак не вытрымаў, і ўжо за Бярэзінай мы аказаліся босыя. Ногі бацькі збілі ў кроў і нехта ім падарыў лапці. Калі мы прыехалі ў Саратаў, мае бацькі прыйшлі ўладкоўвацца ў гэтых лапцях на працу — ва ўпраўленне па справах мастацтваў. Бацьку тады далі работу, там Маскоўская кансерваторыя знаходзілася ў эвакуацыі, Саратаўская кансерваторыя была. Маці работу не далі, і яна пайшла на курсы кіроўцаў, скончыла іх і вазіла на грузавіку марожаную рыбу. Потым яе ўзялі ў музей імя Радзішчава намеснікам дырэктара і галоўным захоўнікам.

А 28 чэрвеня ў Мінск увайшлі немцы. Маці ўсё жыццё потым шукала тое, што складала 24 чэрвеня ў скрыні.

Развагі

— Вальмен Мікалаевіч, што на ваш погляд, важна мець у жыцці?

— Мэту. Прычым далёкую. Каб бачылася перспектыва. Для мяне гэта яшчэ павінна быць і творчая мэта. Гэта дае сілы, прымушае трымаць форму, натхняе. Як у 20 гадоў у мяне былі творчыя мэты, так і цяпер іх не менш. А ўжо колькі з іх наканавана будзе дасягнуць, паглядзім.

Размаўляла Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

БІЗНЭС БУДЗЕ АБАРАНЯЦЦА АД НЕПРАВАМЕРНЫХ ДЗЕЯННЯЎ І РЭЙДАРСТВА

Цэнтр абароны правоў уласнасці, прадпрымальнікаў і кіраўнікоў хутка будзе створаны пры Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва. Пра гэта на прэс-канферэнцыі расказала журналістам **прадпрымальнік з Наваполацка Яўгенія БАЧУРНАЯ**, якая з'яўляецца аўтарам ідэі стварэння такога цэнтра:

— У сёмым артыкуле Канстытуцыі напісана пра верхавенства права. Мы ўпэўнены, што пры дапамозе Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва кожны прадпрымальнік, які ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам, павінен быць абсалютна ўпэўнены, што дзяржава яго абароніць і не дазволіць неправамоцных дзеянняў, і задача нашага цэнтра — гэтага дабіцца.

Яўгенія Бачурная расказала, што яна не па чутках ведае пра праблемы прадпрымальнікаў у галіне абароны сваіх правоў:

— У дачыненні да мяне была заведзеная крымінальная справа і, знаходзячыся 3,5 года ў месцах пазбаўлення волі, я 10 гадзін кожныя суткі прысвячала вывучэнню нарматыўных дакументаў, якія датычацца абароны мяне як грамадзяніна і як прадпрымальніка. І пасля вывучэння тысячаў нарматыўных дакументаў я прыйшла да высновы, што сёння неправамоцныя абвінавачванні могуць быць знятыя, суды і праваахоўныя органы прыслухоўваюцца да аргументаў, але толькі тады, калі тыя прыводзяцца дакладна, ясна і ў адпаведнасці з заканадаўствам. Ісціны дабіцца можна, але складана. — Задача нашага Цэнтра абароны правоў уласнасці, прадпрымальнікаў і кіраўнікоў — гэта інфармаванне адпаведных дзяржаўных органаў, абарона ў судах, удзел у распрацоўцы нарматыўных дакументаў. Разам з тым, хачу звярнуць увагу на важнасць стварэння аналагічных цэнтраў у рэгіёнах — напрыклад, сёння ў Полацкім дзяржаўным універсітэце вучыцца па спецыяльнасці «юрыст» 380 чалавек на вочным і 330 на завочным аддзяленні, але за дзесяцігоддзе існавання факультэта юрыстаў, якія маюць пасведчанне аб атэстацыі юрыста, — толькі пяць чалавек. І не паверыце, што пры насельніцтве 200 тысяч чалавек у рэгіёне Полацка і Наваполацка існуе толькі адна прыватная юрыдычная фірма, якая мае права аказваць юрыдычныя паслугі... Так што для рэгіёнаў гэта вельмі важна і надзённа.

Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў, які ўзначаліць гэты новы цэнтр абароны правоў бізнэсу, расказаў, што перад стварэннем такой структуры яны кансультаваліся з дзясяткамі кіраўнікоў прадпрыемстваў розных рэгіёнаў:

— Нам усе кажуць, што калі раптам «грымне гром», то няма з кім нават параіцца. Калі ўзнікаюць праблемы, калі арыштоўваюцца рахункі і маёмасць, то кіраўнікі проста не ведаюць, як сябе паводзіць. Яны ў шоку, і ад іх захаваюцца ўсе — і ўлады, і партнёры. Перарываюцца кантракты, банкі перастаюць крэдытаваць, фірма становіцца збытнаая кайданамі фінансавых абавязацельстваў... Вось прыклад Яўгеніі Бачурнай, у якой вывезлі грузавікамі дакументы з фірмы 3,5 года таму, калі заводзілі крымінальную справу. А цяпер гэтыя дакументы знайсці не могуць — няма ўжо тых службовых асобаў, якія забіралі дакументы. І што рабіць, як далей працаваць, бо яна ж з бізнэсу не пайшла? І гэта не адзін факт, гэта негатыўна ўплывае на дзелавы асяродак, на інвестара, які не хоча трапляць у аналагічныя сітуацыі. Таму наш цэнтр будзе аказваць рэальную дапамогу тым людзям, хто ўзяў на сябе груз стварацъ фірму, нарошчваць уласнасць, канкурыраваць — такі чалавек атрымае нашу падтрымку, кансультацыю і зможа спакойна працаваць.

Разам з тым, Уладзімір Мікалаевіч лічыць, што такі цэнтр абароны правоў прадпрымальнікаў будзе перашкодай і для так званых рэйдарскіх захопаў:

— Мы ведаем па практыцы Расіі, што ў рэйдарскіх захопах выкарыстоўваюцца абвінавачванні прадпрымальнікаў, завядзенне крымінальных спраў з мэтай аказання ціску на прадпрымальніка, каб ён аддаў сваю справу ці сегмент рынку. Таму трэба, каб у нашай беларускай прасторы людзі адчувалі сябе спакойна і нармальна працавалі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЛЯ ПЛОШЧЫ ПЕРАМОГІ Ў ВІЦЕБСКУ З'ЯВІЦЦА ПАРК ПЕРАМОЖЦАЎ

Сквер, які знаходзіцца ў самым цэнтры горада, атрымае назву «Парк Пераможцаў».

Ідэя ператварыць існуючы сквер імя Міхаіла Калініна ў парк Пераможцаў належыць старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандру Косінцу. Бераг Заходняй Дзвіны будзе ачышчаны, фарватар ракі пашыраны, і па хвалях пачне курсіраваць цеплаход.

А добраўпарадкаваны сквер стане яшчэ адным добрым падарункам ветэранам вайны да 65-годдзя святкавання Перамогі. Сімвалічна, што цяпер плошча Перамогі ў Віцебску — адна з самых вялікіх у Еўропе. Усе галоўныя дзяржаўныя святы, урачыстасці праводзяцца менавіта тут. І парк увойдзе ў склад па-свойму ўнікальнага комплексу, прысвечанаму Вялікай Перамозе.

— Пераўтварэнне сквера імя Калініна ў прыгожы парк Пераможцаў запланавана завяршыць сёлета да святкавання Дня Перамогі. Парк стане месцам сямейнага адпачынку, патрыятычнага выхавання, — адзначыў губернатар на сумесным пасяджэнні прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і аблвыканкама. — І, безумоўна, прыгожы парк стане і прывабным турыстычным аб'ектам.

Работы па добраўпарадкаванні, пакуль яшчэ сквера, фактычна будуць весціся разам з працягам рэканструкцыі плошчы Перамогі. У будучыні ў парку Пераможцаў задумана адкрыць і першую ў Віцебску «трасу» для скейтбардыстаў, высадзіць шмат кветак, новыя дрэвы.

Пераймяноўваецца і парк імя Леніна — гэта будзе парк імя Героя Савецкага Саюза Міная Шмырова. Ля віцебскага музея Шмырова запланавана стварыць музей ваеннай тэхнікі пад адкрытым небам. Сам музей быў адкрыты ў 1969 годзе. І тысячы экспанатаў расказваюць пра подзвігі легендарнага бацькі Міная і гісторыю партызанскага руху.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Першая зіма Купалы

АПЫНУЎШЫСЯ днямі ў Вязынцы і ўволю паблукаўшы па пратаптаных сцежках у глыбокім снезе (даўно не бачыў такога снегу), вырашыў даведацца ў супрацоўнікаў філіяла купалаўскага музея, якой была першая зіма Яскі Луцэвіча (вядома, у зіму 1882—1883 гадоў ён яшчэ не быў славутым Янкам Купалам). Магчыма, тая зіма была гэткая ж снежная, і паўгадовы хлопчык, хай сабе і з рук старэйшых, бачыў і эмацыйна перажываў казачную прыгажосць.

—На жаль, мы не ведаем, якой была тая першая Купалава зіма, — паціснулі плячыма дзве супрацоўніцы. — Нам таксама гэта цікава, але гэткіх звестак музей не мае.

І дадалі сваё меркаванне, што раней усе зімы былі сапраўдныя, як сёлета.

Нічога не ўдалося высветліць і па тэлефоне, калі я пазваніў непасрэдна ў сталічны Купалаўскі музей.

— Акрамя адной фразы «Я нарадзіўся ў Вязынцы» ў сваіх аўтабіяграфічных успамінах Купала нічога не паведаміў пра гэты куток. Тым больш пра першую зіму, — ласкава паведаміў жаночы голас на другім канцы. Супрацоўніца музея звярнула маю ўвагу на тое, што ў Купалавай паэтычнай спадчыне ёсць шмат твораў, прысвечаных зіме.

Заставалася адна надзея на службу Белгідрамета, дзе захоўваюцца звесткі сінаптычных назіранняў болей як стагадовай даўніны. Званю, пытаюся пра тэмпературны рэжым зімы 128-гадовай даўнасці на тэрыторыі былой Мінскай губерні. Спецыяліст гэтай установы, зазірнуўшы ў архівы, праз некаторы час паведаміла, што сярэдняя тэмпература зімы 1882—1883 гадоў была амаль мінус 8 градусаў (сапраўды, як сёлета), пры кліматычнай норме мінус пяць з паловаю. А вось пра снегавое покрыва нічога сказаць не здолела, бо звесткі пра ападкі ў Беларусі пачалі фіксаваць толькі з 1936 года.

У Вязынцы Луцэвічы пражылі да 1883 года, пераехаўшы на новае месца арэнды зямлі ў вёску Юзафова цяперашняга Барысаўскага раёна. Верагодней за ўсё, сваю другую зіму ікні першынец Ясік правёў менавіта там, пракладваючы свае першыя сцяжынкі ў глыбокім снезе.

Няцяжка было знайсці Купалаў верш пра зіму, зазірнуўшы ў шматтомны збор яго твораў. Вось кавалачак аднаго з зімовых прысвячэнняў:

...Век халодны, без адмены
Мароз стукае ў сцены,
А ад снегу днём і ночай
Іскры сыплюцца ў вочы...

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ЛЮДЗЯМ АБРЫДЛІ КАНФЛІКТЫ І ЗВАДКІ

На справаздачна-выбарчай канферэнцыі Гродзенскага гарадскога аддзела Саюза палякаў Беларусі адпаведныя пасведчанні былі ўручаны шэрагу новых членаў гэтай грамадскай арганізацыі.

— Мяркую, што колькасны склад нашага аб'яднання будзе і надалей павялічвацца, — лічыць **Казімір ЗНАЙДЗІНСКІ**, які быў зноў абраны **кіраўніком гарадскога аддзела СПБ**. — Людзям абрыдлі канфлікты і звадкі. Яны зацікаўленыя ў канкрэтных кроках па адраджэнні і развіцці польскай мовы і культуры, нашых традыцый.

Аб падтрымцы мясцовымі ўладамі гэтых імкненняў сведчыць той факт, што магчымасць для вывучэння польскай мовы на сёння створана ў Гродне ў 40 дашкольных установах і ў 23 установах сярэдняй адукацыі.

20 лютага ў Гродзенскім драматычным тэатры па ініцыятыве мэра абласнога цэнтра Барыса Казялкова і яго калегі з Беластока Тадэвуша Трускаляскага пройдзе вечар памяці Чэслава Немэна з удзелам польскіх і беларускіх артыстаў. А 4 сакавіка ў Гродне адбудзецца кірмаш народных умельцаў «Казюкі», арганізатарам якога ўжо традыцыйна выступае СПБ. Чакаецца, што прыедуць майстры не толькі з Гродзеншчыны, але і з іншых рэгіёнаў Беларусі, а таксама госці з Літвы і Польшчы.

ПАДАРУНКАВЫ ЧЭК ДЛЯ ВАЛЯНЦІНА І ВАЛЯНЦІНЫ

14 лютага ўсе наведвальнікі Гродзенскага гандлёвага дома «Нёман» з імем Валянцін і Валянціна пры пакупцы ў прамысловых секцыях атрымаюць падарункавы чэк. Сюрпрыз чакае і тых, хто да 14 лютага пакіне «валянцінку» з фатаграфіяй пары і прызнаннем у каханні на цуда-дрэве, якое «расце» на першым паверсе. Пераможцы гэтай акцыі атрымаюць падарункі на свяце, што адбудзецца 15 лютага.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Кватэрнае пытанне

Знялі без падстаў? Значыць, паставяць

Мне як маладому спецыялісту выдзелілі службовае жылое памяшканне і знялі з кватэрнага ўліку па месцы працы. Ці законна гэта?

Л.М., *Магілёў.*

Выдзяленне работніку службовага жылога памяшкання не можа быць падставай для зняцця яго з уліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Згодна з падпунктам 3.1.6 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзяленне жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) пражыванне ў службовых жылых памяшканнях само па сабе з'яўляецца падставай для прыняцця грамадзян на кватэрны ўлік (калі яны не маюць ва ўласнасці іншага жылога памяшкання ў населеным пункце па месцы прыняцця на ўлік агульнай плошчай 15 кв. метраў і больш на аднаго чалавека, якое адпавядае вызначаным для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням).

Калі малады спецыяліст не мае ў гэтым населеным пункце ва ўласнасці іншага жылога памяшкання, то рашэнне аб зняцці яго з кватэрнага ўліку па месцы працы не можа быць правамерным.

У адпаведнасці з пунктам 32 названага Палажэння рашэнне аб зняцці з уліку можа быць абскарджана ў судовым парадку.

Віктар САВІЦКІ.

Факт

«Сюрпрыз» абышоўся ў 63 мільёны

Следчым аддзяленнем папярэдняга расследавання Фрунзенскага РУУС заведзена крымінальная справа ў дачыненні да 32-гадовага непрацуючага жыхара дома 8, корпус 2 па вуліцы Сердзіча, які 6 лютага паднёс яшчэ той «сюрпрыз» суседзям.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, тады каля трох гадзін дня ламыснік у сваёй кватэры наўмысна пашкодзіў абсталяванне газавай пліты. У выніку адбыўся моцны выбух, які адчулі ўсе жыхары дома: з будынка прыйшлося эвакуяваць 42 чалавекі. Ад удару ў пад'ездзе было поўнасцю выбітае шкло, у некаторых кватэрах — дзверы, разбураныя міжпакаёвыя перагародкі. Страта ад «праступку» падазронага, які ў той дзень быў дастаўлены нецвярозым у бальніцу з апёкамі, склала 63 мільёны рублёў. Цяпер ён затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Ігар ГРЫШЫН.

Былы супрацоўнік МУС абвінавачваецца ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю КДБ Беларусі Ігара ШУНЕВІЧА**, крымінальная справа, заведзеная ў дачыненні да былога начальніка галоўнага ўпраўлення аператыўна-вышуковай дзейнасці МУС Беларусі Івана Шышлы, цяпер знаходзіцца ў судзе. Ён

14 лютага — Новы год па-кітайску

САБАК ЧАКАЕ ФЕЕРЫЧНЫ РАМАН, ДРАКОНАЎ — ДОБРЫ ДАХОД

ПАВОДЛЕ Кітайскага (Усходняга) календара, Новы год адзначаецца на другі маладзік пасля зімовага сонцастаяння. Сёлета яго будуць сустракаць 14 лютага. У свае правы ўступае Тыгр. Якім ён будзе для кожнага з 12 знакаў усходняга гараскопа, нам расказаў астролаг Уладзімір ВАСЮК.

Для **Зайца (Ката) — 1927, 1939, 1951, 1963, 1975, 1987, 1999** — год будзе актыўным і дынамічным. Ён можа цалкам перавярнуць ваша светаўспрыманне і ўяўленне аб іншых людзях. У кар'еры верагодныя і нечаканыя ўзлёты, і падзенні, сумаваць не давядзецца. Ёсць шанц атрымаць нечаканы даход: выйграць у латарэю, атрымаць спадчыну ці павышэнне заработнай платы. У асабістым жыцці сітуацыя будзе паступова паляпшацца, і ў чацвёртым квартале верагодныя яскравыя, запамінальныя, лёсавызначальныя падзеі. Псіхалагічна гэты год для вас будзе ўспрымацца як катанне на «амерыканскіх горках». Зоркі раяць быць уважлівымі і не здзіўляцца сюрпрызам, не ўспрымаць жыццё і навакольных варожа. Ваш лёс — у вашых руках.

Для **Дракона — 1928, 1940, 1952, 1964, 1976, 1988, 2000** — энергетыка года прадугледжвае выбар сур'ёзнай узважанай жыццёвай пазіцыі. Уменне давяраць сабе, наладжваць асабістыя дзелавыя кантакты і узаемадзейнічаць з навакольнымі (роднымі, сваякамі, сябрамі і знаёмымі) выключна ў пазітыўным рэчышчы — стануць галоўнымі фактарамі поспеху. Гэта год, калі лепш быць вучнем, а не настаўнікам. У кар'еры намячаецца павольны прагрэс. У асабістым жыцці праблемы могуць узнікаць з-за вашай пастаяннай незадаволенасці — сабой, навакольнымі. Зоркі раяць не зацыклівацца на крытыцы і звяртаць увагу на тыя станоўчыя светлыя моманты, хай сабе і дробныя, якія прыносіць з сабой кожны новы дзень. У плане фінансаў у першых трох кварталах верагодныя добрыя даходы, а вось у апошнія тры месяцы года варта перайсці ў рэжым эканоміі, магчымыя няўдалыя капіталаўкладанні, якія прывядуць да сур'ёзных фінансавых стратаў.

Змяя — 1929, 1941, 1953, 1965, 1977, 1989, 2001 — сёлета можа аказацца абсалютна неабаронены перад рэаліямі жыцця. Ёй давядзецца праявіць увесь свой розум і вынаходлівасць, каб дабіцца поспеху. Важна навучыцца жыць тут і зараз, а не днём учарашнім, ці марамі аб будучыні. У кар'еры многае будзе залежаць ад тых мэтаў і задач, якія вы перад сабой паставіце. Калі яны рэальныя — жыццё будзе даваць вам шанцы для іх хуткай рэалізацыі. Калі ж сустрэнецеся са шматлікімі цяжкасцямі, значыць, варта перагледзець свае мэты. У плане фінансаў у першай палове года будзе адбывацца паступовае паляпшэнне сітуацыі, у другой — з'явіцца больш расходаў. У асабістым жыцці актуальным стане прынцып адказнасці — за сябе, за свае словы і ўчынкі.

Для **Каня — 1930, 1942, 1954, 1966, 1978, 1990, 2002** — год стане вельмі актыўным і пазітыўным, дазволіць значна ўмацаваць свае кар'ерныя пазіцыі — пры ўмове, што вы не станеце выстаўляць сябе ахвярай лёсу, абставінаў і з гэтай прычыны здымаць з сябе адказнасць. Для вас гэта год лідарства. Вам давядзецца стаць лідарам і ў сям'і, і на працы. Лідарства і адказнасць — два асноўныя фактары поспеху для вас у год Тыгра. Калі вы не пабаіцеся ўзяць на сябе адказнасць, жыццё знойдзе людзей, якія ў крытычныя перыяды змогуць быць абавязковымі і адказнымі ў дачыненні да вас. Матэрыяльны дабрабыт будзе прырастаць павольна, але напрыканцы года вы заўважыце, наколькі ён палепшыўся. У асабістым жыцці гэты год добра падыходзіць для стварэння сям'і, афармлення доўгатэрміновых адносінаў — для любых актыўных ініцыятыў, якія распачнуць новы сур'ёзны этап. На шляху кар'ернага росту перашкод будзе мінімум, усе праблемы вы будзеце ствараць сабе самі.

Для **Казы (Авечкі) — 1931, 1943, 1955, 1967, 1979, 1991, 2003** — гэты год адкрые новыя магчымасці прагрэсу і росту, але ўдача будзе залежаць ад таго, наколькі хутка і актыўна вы зможаце рухацца наперад. Калі сёлета вы не сустрэнеце перашкод, варта задумацца — ці туды вы ідзяце (каго нябесная канцылярыя любіць, таму яна дае і больш складаныя задачы. Калі год будзе насычаны падзеямі — і станоўчымі, і не вельмі, значыць, космасу вы не абыякавыя). У гэтым годзе фінансавае становішча можа быць на зайздрасць выдатным: ёсць шанц атрымаць спадчыну, выйграць у латарэю ці ўдала ўкласці сродкі. Зоркі раяць асабліва не раскідвацца грашыма, але і не скупнічаць. Праявіце мудрасць у расходаванні грошай. У адносінах з супрацьлеглым полам асабліва значэнне будзе мець самакантроль — адным неасцярожным словам можна паламаць усё, што вы ўзводзілі гадамі. Астролагі раяць дасканала вывучаць свае патрэбы, мэты і памкненні — і тады жыццё дасць вам менавіта тое, што вам неабходна для шчасця. У кар'еры варта цвёрда прытрымлівацца сваіх маральных прынцыпаў. У цэлым гэта год праверкі вашага сумлення.

У **Малпы — 1932, 1944, 1956, 1968, 1980, 1992, 2004** — сёлета поспех будзе прама прапарцыянальны ўкладзеным сілам. Не трэба імкнуцца атрымаць ад жыцця ўсё і адразу. Кожны дзень рабіце нешта, што дапаможа дабіцца сваёй мэты. Самае галоўнае — не спыняйцеся на дасягнутым. Рост дабрабыту будзе павольным, але няўхільным на працягу ўсяго года. Зоркі раяць вам зрабіць пэўныя зберажэнні, бо канец 2010 года падорыць шмат выдатных магчымасцяў прыбытковых укладанняў (набыць нерухомасць, аўтамабіль і іншыя рэчы і тавары, пра якія вы доўга марылі). Асабістае жыццё будзе нагадваць катанне на «амерыканскіх горках» (чакайце і ўзлётаў, і падзенняў). Ваш поспех у гэтым плане будзе залежаць ад вынікаў вашай работы над сабой (неабходна прывесці ў парадак цела, знешні выгляд, думкі і жаданні). Галоўнае — зрабіце хоць што-небудзь для таго, каб жыццё блізкіх вашаму сэрцу людзей стала больш гарманічным і шчаслівым . Асаблівую ўвагу звярніце на стан здароўя старэйшых членаў сям'і.

Пеўню — 1933, 1945, 1957, 1969, 1981, 1993, 2005 — год падорыць мора магчымасцяў для персанальнага росту, якія будуць адкрывацца перад ім ледзь не кожны дзень. Варта не прапусціць іх. А для гэтага трэба найперш паверыць у сваю шчаслівую зорку. Сёлета для вас асабліваю актуальнасць набудзе выраз «па веры вашай будзе вам». Паверце ў сваё шчасце і поспех. У плане фінансаў сітуацыя будзе пераменлівай — то пуста, то густа. Значны рост матэрыяльнага дабрабыту чакаецца ў першым паўгоддзі. Пры планаванні расходаў давярайце інтуіцыі і намагайцеся не траціць усе наяўныя грошы. Асабістае жыццё прынясе шмат сюрпрызаў. Унутраныя страхі могуць увасобіцца ў жыццё, таму варта быць вельмі асцярожнымі ў думках (не збівацца на негатыў і быць аптымістамі). У першым і трэцім кварталах ёсць шанц прасунуцца ў кар'еры.

Адданасць **Сабакі — 1922, 1934, 1946, 1958, 1970, 1982, 1994, 2006** — сваім блізкім, сваёй сям'і, сябрам сёлета будзе ацэнена. У асабістым жыцці чакаецца шмат перамен, прычым у асноўным — пазітыўных. Вы адчуеце, што каханне ў канчатковым выніку вяртаецца каханнем. У гэтым годзе, асабліва ў трэцім і чацвёртым кварталах, вы будзеце перажываць надзвычай яскравыя, феерычныя раманы. Для сямейных людзей гэта будзе час сур'ёзных пазітыўных перамен, прагрэсу і росту. У кар'еры Сабакам давядзецца сутыкнуцца з дылемай: хуткі прагрэс, які абумовіць далейшае няўстойлівае становішча, ці павольны рост і стабільнасць. Зоркі раяць вам сёлета пажыць у сваё задавальненне — толькі без шкоды для навакольных. Памятайце: што вы «выпраменьваеце» ў свет, тое атрымліваеце і назад.

Для **Свінні (Кабана) — 1923, 1935, 1947, 1959, 1971, 1983, 1995, 2007** — год стане перыядам закладкі асноў, фундамента пад далейшую шчаслівую будучыню. У гэты час актывізуецца ланцуг падзей, якія будуць актуальнымі на працягу некалькіх наступных гадоў. Не падштурхоўвайце перамены, не спяшайцеся, усё адбудзецца ў належны час. Важна, каб сёлета вы навучыліся жыць тут і зараз. У кар'еры поспех напрамую будзе залежаць ад вашых камунікатыўных здольнасцяў (умення наладжваць гарманічныя стасункі з калегамі і кіраўніцтвам, знаходзіць кампрамісы). На працягу года верагодныя лёсавызначальныя перамены ў асабістым жыцці, але вам давядзецца зрабіць выбар паміж кар'ерай і каханнем. Што выбраць — залежыць ад вас, ад вашага разумення шчасця, дабрабыту. Сёлета ў вас з'явяцца значныя расходы, таму варта пачаць рабіць назапашванні.



Для **Мышы (Пацука) — 1924, 1936, 1948, 1960, 1972, 1984, 1996, 2008** — год стане актыўным, дынамічным і вельмі перспектыўным. Сямейныя справы запатрабуюць вашага непасрэднага ўдзелу. Прыйшоў час стаць лідарам у сям'і, узяць на сябе частку абавязкаў іншых яе членаў. Сітуацыя ў асабістым жыцці будзе залежаць ад таго, якія ахвяры вы зможаце прынесці дзеля сям'і. Вялікае пачуццё патрабуе вялікай ахвяры. Для аднаго такой ахвярай стане адмова ад дрэннай звычкі, для другога — работа над сваім характарам, для трэцяга — вольны час, які будзе затрачаны на вырашэнне сямейных праблем. У асабістым жыцці гэты год будзе ўнікальным — ён дасць магчымасць як зрабіць моцны рывок наперад, так і быць адкінутым назад. Галоўнае — ведаць, чаго вы чакаеце ад партнёра і ад адносінаў увогуле, не вымяраць каханне грашыма. Кар'ерны рост будзе павольным. Вам трэба больш дакладна ўсвядоміць свае мэты (чаго вы хочаце дасягнуць?) і больш адэкватна ацэньваць калегаў і начальства.

Для **Быка — 1925, 1937, 1949, 1961, 1973, 1985, 1997, 2009** — год стане перыядам павольнага, няўхільнага росту. Могуць адбыцца значныя змены ў блізкім акружэнні. З'явіцца новыя сябры, знаёмыя. Кола зносінаў моцна абнавіцца. Уменне дзень за днём працаваць дзеля дасягнення сваёй мэты, пакрысе набліжацца да яе, нягледзячы на перашкоды, стане галоўным фактарам поспеху. Гэта перыяд, калі вялікую ўвагу трэба звярнуць на замацаванне сваіх пазіцый у кар'еры. Бізнэсменам зоркі раяць прыслухоўвацца да сваёй інтуіцыі, вашы ідэі могуць прынесці значны прыбытак. Падзеі ў асабістым жыцці будуць развівацца вельмі дынамічна, у лепшых традыцыях любоўных камедый.

Тыграм — 1926, 1938, 1950, 1962, 1974, 1986, 1998 — год прынясе шмат магчымасцяў прасунуцца ў кар'еры, умацуе вашу ўпэўненасць у сваіх сілах, напоўніць аптымізмам і жаданнем «звярнуць горы». Але памятайце, што эвалюцыя можа ісці як па шляху прагрэсу, так і дэградацыі. Каб дасягаць поспеху, стрымлівайце сябе, не раскідвайце навакольных локцямі. Гэта надзвычай добры год для таго, каб распачаць сваю справу, свой бізнэс, новы цыкл у кар'еры. У асабістым жыцці будуць дамінаваць станоўчыя тэндэнцыі. У вас з'явіцца магчымасць сустрэць сапраўднае ВЯЛІКАЕ КАХАННЕ, стварыць сям'ю, перажыць дзіўны, незабыўны раман. Чым больш дакладна вы будзеце ўяўляць — што вам патрэбна для шчасця, тым больш шанцаў сёлета гэта атрымаць. Што датычыцца фінансаў, у трэцім-чацвёртым кварталах жыццё дасць вам магчымасць добра зарабіць. Але сітуацыя можа змяніцца, таму, калі на вас пачнуць сыпацца грошы, пастарайцеся іх сэканоміць.

Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.

12 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ У БРОНЗЕ

Пільны міліцыянер збярог іх магілёўскаму прадпрыемству.

5 лютага каля 2 гадзін ўначы кампанія з чатырох маладых людзей спрабавала абакрасці завод "Строммашына". Узрост злодзеяў — ад 21 да 24 гадоў, трое раней судзімыя. Адзін з іх працаваў на заводзе.

Яны разбілі акно ў прыбіральні і адтуль праніклі ў склад. Праз разбітае акно выкідалі на вуліцу бронзавыя вырабы да прасавальных станкоў. Потым маладыя людзі перацягвалі вельмі цяжкую бронзу да аўтамабіля.

На апошнім этапе крадзяжу падазроную мітусню на вуліцы заўважыў супрацоўнік Ленінскага РАУС, які вяртаўся з дзяжурства. Міліцыянер выклікаў нарад, які затрымаў начных злодзеяў.

Алена КАЗЛОВА.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

по продаже имущества ООО «Терра Девелопмент», находящегося по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, 1 А этаж.

Лот № 1 — Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-69175, общей площадью 502,3 кв. м (используемое как зал игровых автоматов), расположенное в г. Бресте по ул. Московская, 202, 1 А этаж, окончательной стоимостью с учетом НДС 2 412 328 800 (Два миллиарда четыреста двенадцать миллионов триста двадцать восемь тысяч восемьсот) белорусских рублей. Шаг торгов — 5 процентов стоимости имущества в размере 120 616 440 рублей. Лицо, желающее принять участие в торгах, обязано, не позднее чем за 24 часа до начала торгов, внести на соответствующий счет хозяйственного суда сумму в размере 10 процентов от стоимости продаваемого лота, подать заявку на участие в торгах и дать подписку о том, что нет препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/

Торги состоятся 25.02.10 в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, 1А этаж.

За дополнительной информацией обращаться к судебному исполнителю Глущцовой Ж.В. г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 113, тел. ф. (017) 294 93 80.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ 18 февраля 2010 г.

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Продавец	Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Изолированное помещение (столовая и магазин)**	г. Гомель, ул. Объездная, 12	Управляющий в деле о банкротстве УП «Торговый дом «Гомельпласт»	Год постройки – 1985, материал стен – кирпич, ж/б панели, общая площадь изолированного помещения – 867,8 м², в том числе: площадь столовой 822,4 кв.м, площадь магазина 45,4 кв.м. Изолированные помещения расположены в 4-этажном здании.	177 079 200	8 854 000
Срок подачи заявления		**До 17.00 17 февраля 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а				
Дата, время, место проведения аукциона		**18 февраля 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»				
Номер р/с для перечисления залога		Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509				
Условие продажи		Без условий. Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 8% , вознаграждение – 4 %				
Условие пользования		Объекты продаются в собственность.				

Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

г. ВИТЕБСК — **18.03.2010**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Капитальное строение с инв. № 232/С-18857 (здание пожарного депо), расположенное по адресу: Витебская область, Докшицкий район, Парафьяновский с/с, аг. Парафьяново, ул. Советская, д. 2б,	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, общая площадь 67,8 кв.м, 1986 г. постройки, фундамент бутовый, перекрытия деревянные, крыша шиферная. Земельный участок: с кадастровым номером 222183406101000228 площадью 0,0079 га для содержания и обслуживания объекта недвижимости, сроком аренды 99 лет. Назначение – под объект общественного назначения.	**9 438 358**	**943 835**
С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ				
2.	Незавершенный строительством объект «Музей-усадьба И. Буйницкого», расположенный по адресу: Витебская область, Глубокский район, Прозороцкий с/с, д. Прозороки, ул. Вокзальная, 22, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: незавершенный строительством объект общая площадь 505,7 кв.м, фундамент – ж/б блоки, перекрытия – ж/б плиты, стены блочные – облицованные кирпичом, кровля – нет, полы – нет, проемы – нет, внутренняя отделка – нет. Процент готовности – 10 %. Земельный участок: с кадастровым номером 221585411601000187 площадью 0,2567 га для обслуживания объекта «Музей-усадьба И. Буйницкого», сроком аренды 40 лет.	**94 340**	**9 434**
3.	Здания и сооружения оздоровительного лагеря «Орленок», расположенные по адресу: Витебская область, Витебский район, Мазоловский с/с, в 3-х км севернее дер. Дреколье, и право заключения договора аренды земельных участков.	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инв. № 200/С-66364 (танцевальная площадка), д. 1/12, общ. площадь 202,3 кв.м; - капитальное строение с инв. № 200/С-65682 (здание бани с купальней), д. 2, общ. площадь 65 кв.м, одноэтажное деревянное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65689 (административно-хозяйственное здание), д. 1, общ. площадь 70 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65699 (здание корпуса 6/4 с холодной пристройкой), д. 1/10, общ. площадь 177 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65703 (дом сторожа № 2 с холодной пристройкой), д. 1/2, общ. площадь 57 кв.м, одноэтажное деревянное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65711 (здание материального склада), д. 1/5, общ. площадь 91 кв.м, одноэтажное блочное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65712 (здание столовой с подвалом), д. 1/6, общ. площадь 481 кв.м, одноэтажное кирпичное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65713 (здание корпуса 8/1 с холодной пристройкой), д. 1/8, общ. площадь 183,0 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65714 (здание корпуса 11/2 с холодной пристройкой), д. 1/9, общ. площадь 178 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65715 (здание медпункта с холодной пристройкой), д. 1/1, общ. площадь 53 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65718 (дом сторожа № 1 с двумя холодными пристройками, колодцем, ограждением территории), д. 1/3, общ. площадь 37 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65722 (здание дачи с холодной пристройкой), д. 1/4, общ. площадь 119 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65724 (здание корпуса 9/6 с холодной пристройкой), д. 1/11, общ. площадь 183 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-65788 (здание корпуса 10/7 с холодной пристройкой), д. 1/7, общ. площадь 180 кв.м, одноэтажное каркасно-засыпное; - капитальное строение с инв. № 200/С-67906 (наружная водопроводная сеть – трубопровод напорный, артезианская скважина, павильон, забор); - капитальное строение с инв. № 200/С-66805 (наружная электрическая сеть), протяженность 674,3 м; - капитальное строение с инв. № 200/С-66806 (кабельная линия 10 кВ), протяженность 90 м. Земельные участки: для содержания и обслуживания зданий и сооружений оздоровительного лагеря «Орленок», срок аренды 50 лет, с кадастровым номером 221285900001000171 площадью 3,3563 га и с кадастровым номером 221285900001000172 площадью 0,0131 га. Ограничения в использовании в связи с нахождением земельных участков в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос (оз. Боровское).	**2 605 070**	**260 507**
4.	Здание бани с холодной пристройкой, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, дер. Малое Ситно, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 250/С-31162 (здание бани с холодной пристройкой), одноэтажное кирпичное, фундамент бетонный, а/ц листы по деревянным стропилам, общ. площадь 84 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223883803101000020 площадью 0,0325 га для содержания и обслуживания недвижимого имущества, сроком аренды 50 лет. Назначение – для размещения объектов: административно-хозяйственного назначения, розничной торговли, общественного питания, гостиничного назначения, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, культурно-просветительского и зрелищного назначения, бытового обслуживания населения.	**43 108**	**4 310**
СО СНИЖЕНИЕМ НА 20 ПРОЦЕНТОВ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА				
5.	Здания, сооружения и сеть, расположенные по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Невельская, 63б, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение инвентарный № 250/С-20858 (склад № 1) одноэтажное кирпичное здание с цокольным этажом, общая площадь 1238,9 кв.м, объем 5097 куб.м, 1973 г. постройки, фундамент – бетонные блоки, перекрытия – ж/б плиты, крыша совмещенная рулонная; навес для хранения кислородных баллонов, площадью 23 кв.м, фундамент – бетон, кирпич, стены – металлическая сетка по металлическому каркасу из стальных труб, кровля – асбестоцементные листы; уборная двухместная, площадью 3 кв.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, кровля – асбестоцементные листы; дворовое покрытие асфальтобетонное, площадью 1820 кв.м; ворота металлические, площадью 13 кв.м; ограждение – металлическая сетка на железобетонных опорах, площадью 86 кв.м; ограждение – деревянный решетчатый забор на железобетонных опорах с бетонным цоколем, площадью 367 кв.м; ограждение – металлический решетчатый забор на металлических стойках, площадью 155 кв.м; – капитальное строение инвентарный № 250/С-20859 (склад № 2) одноэтажное кирпичное здание, общая площадь 623,8 кв.м, объем 2606 куб.м, 1973 г. постройки, фундамент – бетонные блоки, перекрытия – ж/б плиты, крыша совмещенная рулонная; - капитальное строение инвентарный № 250/С-20860 (гараж) одноэтажное кирпичное здание, общая площадь 142,7 кв.м, объем 720 куб.м 1973 г. постройки, фундамент бетонный, перекрытия – ж/б плиты, крыша совмещенная рулонная; - капитальное строение инвентарный № 250/С-20862 (склад № 5) одноэтажное здание, общая площадь 257,9 кв.м, объем 725 куб.м, фундамент бетонный, стены металлические по каркасу из металлических труб, крыша шиферная; - капитальное строение инвентарный № 250/С-20861 (склад № 4) одноэтажное здание, общая площадь 53 кв.м, объем 170 куб.м, фундамент – бетонные блоки, стены кирпичные, железобетонные блоки, перекрытия – ж/б плиты, крыша совмещенная рулонная; - капитальное строение инвентарный № 250/С-28470 (линия электропередач) площадью 47,3 кв.м. Земельный участок с кадастровым номером 243500000003000043 площадью 0,7534 га для содержания и обслуживания объектов недвижимости, сроком аренды 30 лет.	**812 573 499**	**81 257 349**
6.	Капитальное строение с инв. № 201/С-8433 (здание пожарного депо на один выезд), расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, Вайханский с/с, д. Большие Стайки, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, общая площадь 195,1 кв.м, объем 1127 куб.м, 1993 г. постройки, фундамент – ж/б блоки, перекрытия – ж/б плиты, крыша совмещенная рулонная, полы бетонные. Земельный участок: с кадастровым номером 221882201801000080 площадью 0,4222 га для содержания и обслуживания объекта недвижимости, сроком аренды 99 лет.	**115 828 264**	**11 582 826**

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: по лоту № 2 – Учреждение «Государственный музей истории театральной и музыкальной культуры Республики Беларусь», контактный телефон в г. Минске (017) 227 05 44; по лоту №№ 3, 4 – Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности, контактный телефон в г. Минске (017) 227 52 54, по лоту № 5 – Витебское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактный телефон в г. Витебске (0212) 48 58 53; по лотам №№ 1, 6 – Учреждение «Витебское областное управление Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь», контактные телефоны: (0212) 47 64 09, 47 40 95.

Условия продажи недвижимого имущества:

по лотам №№ 2, 3, 4 – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данных объектах, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

Условия пользования земельными участками:

по лоту № 1 – заключение победителем аукциона с исполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения исполкома о представлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения исполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

по лоту № 2 – получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения исполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок не, превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

по лотам №№ 3, 5 – заключение победителем аукциона с исполкомом договора аренды земельных участков и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения исполкома о представлении ему земельных участков государственной регистрации права на земельные участки;

по лоту №№ 4 – получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения исполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет (в случае изменения назначения недвижимого имущества); осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией (в случае изменения назначения недвижимого имущества);

по лоту № 6 – заключение победителем аукциона с исполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения исполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на реконструкцию объекта в срок, не превышающий 2 года.

Аукцион состоится 18 марта 2010 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе по лотам №№ 1, 5, 6 приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы; по лотам №№ 2, 3, 4 – те же, кроме граждан. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, **без нотариального засвидетельствования**; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования**; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 17.03.2010 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 18.03.2010 с 14.00 до 14.45**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельных участков внести плату за право заключения договора аренды земельных участков, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков; **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельных участков заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельных участков.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (3 лютага)

По гарызанталі: Крысо. Эстамп. Імжа. Кіт. Рур. Акт. Амт. Варан. Аўстралія. «Ака». Зара. Аймак. Раса. «Дон». Азон. Клім. Алні. Уаза. Ятрышнік. Лот. Караван. **По вертыкалі:** Халадзільнік. Румба. Касманаўт. Старт. Раман. Ікра. Аказія. Малако. Турман. Эстэт. Нар. Вяз. Аркуш. Ралан. Асізі. Пустыня. Амак. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

3	1	5	9	4	6	2	8	7
9	8	7	2	1	3	6	4	5
2	6	4	8	7	5	3	9	1
1	5	8	7	3	4	9	2	6
6	4	2	1	5	9	8	7	3
7	3	9	6	2	8	5	1	4
5	2	3	4	9	1	7	6	8
8	7	1	5	6	2	4	3	9
4	9	6	3	8	7	1	5	2

Сканворд (6 лютага)

По гарызанталі: Фудзіяма. Цэх. Імпэт. Сіг. Радэн. Гастраном. Лата. Акунь. Апал. Албанія. Балет. Іран. Тэрмас. Статак. Арэх. Ага. Кава. Арарат. Кале. Карп. Рык. Джаз. Дражэ. Апад. Бур. Агат. Лато. Драч. Манблан. **По вертыкалі:** Лёгкаатлет. Кар. Бор. Ака. Марал. Рында. Эверэст. Ярус. Саха. Ная. Кабала. Ігрок. Пугач. Амур. Апарат. Пуд. Том. Эрэ. Эльбрус. Апа. Тона. Тур. Талі. Аід. Аператар. Ата. Агава. Фол. Накат. Заслон.

Сканворд (9 лютага)

По гарызанталі: «Спартак». Возера. Бура. Фарш. Газ. Ікра. Нанду. Граф. Рота. Бос. Рагач. Кантата. Гай. Док. Крап. Агат. Града. Гастрыт. Кадр. Румба. Рука. Матка. Баран. «Таіс». Пракос. Поні. Ветах. «Папялушка». **По вертыкалі:** Булгакаў. Гам. «Гаянэ». Арда. Гарт. Багдад. Кропка. Квота. Тара. Куба. Сайт. Трап. Ургa. Ёмка. Коп. Веша. Ікона. Зло. Галс. Сіп. Нардэк. Рэтра. Нагода. Рур. Оптыка. «Шчаўкунчык». Танкетка.

ЛЮБОЎ ДА ЖЫВЁЛЫ

28-гадовы галоўны ветэрынарны ўрач КСУП агракамбіната «Віць» Хойніцкага раёна сярод белага дня вывеў з тэрыторыі малочнатварнай фермы карову вагой 400 кг, якая каштуе 1 мільён 700 тысяч рублёў. Паколькі жывёліна была вернута ў стойла і ўсе страты такім чынам кампенсаваныя, выратшана было не заводзіць крымінальнай справы.

З РАЗЛІКОВАГА РАХУНКА КААПЕРАТЫВА НА АСАБІСТЫ

пералічвала грошы бухгалтар аднаго з гаражна-спажывецкіх кааператываў Рэчыцы. Аб махінацыях стала вядома пасля праверак, праведзеных аддзелам па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Гомельскага аблвыканкама ў межах мерапрыемстваў, накіраваных на выяўленне злачынстваў у галіне будаўніцтва. Больш за тры мільёны рублёў зніклі дзякуючы фальшывым плацежным даручэнням, у тым ліку з падробкай подпісу старшыні гаражнага кааператыва. Зараз 28-гадовая жанчына знаходзіцца пад арыштам, як і яе маёмасць.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Кот вучоны супраць пакемонаў

У МАГІЛЁЎСКІМ КІНАТЭАТРЫ «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ПАНУЕ ПУШКІНІЯНА

Абласное грамадскае аб'яднанне «Рускі дом» наладзіла выставу дзіцячых малюнкаў «Мой Пушкін», гарадская бібліятэка прапанавала дзецям кнігі класіка рускай літаратуры, а прадпрыемства «Кінавідэапракат» паказала мультфільмы паводле казак Пушкіна.

Работы маладых магілёўскіх мастакоў паказалі, што любімымі героямі дзятвы застаюцца Залаты пеўнік, цар Салтан, кот вучоны, рыбак з залатой рыбкай, нянька Арына Радзівонаўна, а таксама і сам Пушкін — напрыклад, з Пегасам натхнення.

— Мы хочам, каб у век камп'ютарных гульняў і іншых пакемонаў нашы дзеці памяталі пра разумнае, вечнае і добрае, — сказаў **старшыня «Рускага дома» Юрый ВАЛАБУЕЎ**. — Знаёмыя ўсім з дзяцінства казкі і вершы Аляксандра Пушкіна якраз выклікаюць у сэрцы самыя добрыя пачуцці.

Ілона ІВАНОВА.

Хутка гукаць вясну

У Клімавіцкім раёне 10 лютага супрацоўнікі раённага музея, работнікі культуры і журналісты з фальклорнай экспедыцыяй наведалі вёскі Цімануўскага сельсавета.

Хоць навокал снежныя прасторы да гарызонту, час ужо рыхтавацца да вясны. І таму экспедыцыя сабрала абрадавыя песні веснавога цыкла ў вёсках Красавічы і Рысін. Яе ўдзельнікі хадзілі ў хаты да бабулек, якія памятаюць старадаўнія абрады, расказваюць пра звычаі мінуўшчыны і спяваюць народныя песні. Каб захаваць гэтую культурную спадчыну для нашчадкаў, песні і расповеды запісалі на электронныя носьбіты.

Ілона ІВАНОВА.

Спорт-тайм

Беларускі сцяг узняты ў Ванкуверы

Нацыянальны сцяг беларускай дэлегацыі ўзняты ў галоўнай Алімпійскай вёсцы ў Ванкуверы на XXI зімовых Алімпійскіх гульнях. Склад беларускай дэлегацыі на гэтай цырымоніі быў невялікім. Спартсменам далі час на адпачынак і трэніроўкі, і вырашылі не везці іх з Вістлера — другой алімпійскай вёскі ў гарах, дарога да якой складае 120 км. Цырымонію знаёмства з дэлегацыямі адкрыла трыа індзейцаў, якія білі ў барабаны і выконвалі старажытныя песні. Пасля мэр алімпійскай вёскі павіншаваў нашых спартсменаў са святам — адкрыццём Алімпійскіх гульняў. Па камандзе ганаровая варта ўнесла сцяг Беларусі, які быў узняты на флагштоку побач са сцягам Міжнароднага алімпійскага камітэта. Пасля гэтага прагучаў гімн нашай краіны.

Беларускія хакеісты абгулялі швейцарцаў

У ноч з аўторка на сераду нацыянальная зборная Беларусі па хакеі правяла ў Вінніпегу адзін з двух таварыскіх матчаў супраць швейцарцаў. Як і ў снежні на турніры ў Славакіі, перамогу ва ўпартай барацьбе зноў атрымалі беларусы. Першую шайбу закінуў Аляксандр Макрыцкі, а за 4 секунды да завяршэння авертайма пераможны гол забіў Алег Антоненка. На гэту гульню Міхаіл Захараў выставіў наступны склад: Коваль; Макрыцкі—Караў, Усенка—Антонаў, Коласаў—Стасенка, Радзінскі—Касцючонак, Дзянісаў; Антоненка—Задзялёнаў—Кальцоў, Мялешка—Стась—Кулакоў, Угараў—Міхалёў—Захараў, Дзямагін. Адметна, што некаторыя абаронцы ў гэтым матчы выходзілі ў нападзенні. А Аляксей Калюжны з-за недастаўленай авіякампаніяй экіпіроўкі вымушаны быў назіраць за падзеямі на лёдзе з трыбуны. Галоўны трэнер беларускай каманды Міхаіл Захараў застаўся задаволеным тым, як хакеісты адпрацавалі ў гэтай гульні, нягледзячы на розніцу ў часе, доўгі пералёт і іншыя памеры пляцоўкі. Асобна трэнер вылучыў Коваля, гэтак жа, як і арганізатары, якія назвалі яго лепшым гульцом сустрэчы.

Сцяганосцам будзе Алег Антоненка

Упершыню нацыянальны сцяг на адкрыцці Алімпійскіх гульняў панясе хакеіст. Гэта будзе самы ўзраставы ў нашай камандзе ўдзельнік Гульняў 38-гадовы Алег Антоненка. Сваю спартыўную кар'еру гэты адметны хакеіст пачынаў яшчэ ў чэмпіянаце СССР, першай яго Алімпіядай сталі Гульні ў Нагана-98. Яшчэ адным кандыдатам у сцяганосцы сёлета быў капітан нашай хакейнай дружыны Руслан Салей. Дагэтуль такога гонару быу ўдастоены выключна біятланісты. У 1994 годзе сцяг нёс Яўген Рэдзькін, у 1998 і 2006 гадах Аляксандр Папоў, у 2002-м — Алег Рыжанкоў.

У Ванкуверы не хапае снегу

Сталіцы зімовых Алімпійскіх гульняў па-ранейшаму не хапае снегу. У рэгіёне ўсталявалася анамальна цёплае надвор'е, і горш за ўсё ідуць справы з правядзеннем спаборніцтваў па сноўбордзе. Гульні стартуюць праз дзень, і ўлады спадзяюцца, што капрызнае надвор'е не адаб'ецца на іх планах. Яны імкнуцца выправіць сітуацыю самастойна — да месца правядзення спаборніцтваў на верталётах і грузавіках дастаўляюць тоны снегу з горных раёнаў краіны.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.38	17.10	9.32
Віцебск —	7.31	16.56	9.25
Магілёў —	7.28	17.00	9.32
Гомель —	7.20	17.01	9.41
Гродна —	7.52	17.26	9.34
Брэст —	7.49	17.31	9.42

Месяц

Маладзік 14 лютага.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Герасіма, Івана, Ігната, Канстанціна, Лукі, Рамана, Якава.*

К. *Бажэны, Бернардэты, Брыгіты, Марыі, Альгерда, Рыгора.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

11 лютага

1753 год — пры Віленскім універсітэце заснавана Віленская астранамічная абсерваторыя — адна з найстарэйшых у Еўропе. Яе арганізатарам і першым дырэктарам быў М. Пачобут-Адляніцкі.

1807 год — у вёсцы Варацэвічы (сёння Іванаўскі раён Брэсцкай вобл.) нарадзіўся Напалеон Орда, славуты беларускі кампазітар, піяніст, педагог, мастак. Удзельнічаў у паўстанні 1830-1831 гг., пасля чаго быў вымушаны эміграваць у Францыю. Там музычныя здольнасці Орды адзначыў вялікі Фрэдэрык Шапэн, які быў адным з яго сяброў. Песні і вальсы, паланезы і серэнады Орды карысталіся вялікай папулярнасцю, асабліва сярод эмігрантаў. Іх уключалі ў свае канцэрты і многія вядомыя выканаўцы таго часу. У 40-х гадах XIX стагоддзя Напалеон Орда быў дырэктарам Італьянскай Оперы ў Парыжы — аднаго з самых знакамітых тэатраў Еўропы. Вялікую ўвагу ён надаваў папулярызацыі твораў іншых кампазітараў, выдаваў музычныя зборнікі. У 1856 годзе вярнуўся ў Беларусь. Ужо на радзіме напісаў цікавую тэарэтычную працу — «Граматыка музыкі», якая не страціла сваёй актуальнасці і ў наш час. Падарожнічаючы па Беларусі, Польшчы, Літве і Украіне, рабіў замалёўкі месцаў, звязаных з жыццём знакамітых людзей, і архітэктурных помнікаў. Памёр у 1883 годзе.

Цытата дня:

«Лепш выяўляць свой розум у маўчанні, чым у размовах».

Артур ШАПЕНГАЎЭР (1788—1860), нямецкі філосаф.

Святкуем Масленіцу

Асаблівым эмацыйным настроем заўсёды вылучаўся пераход з працяглай, манатонна-засцюжанай зімы ў доўгачаканую, юрлівую, эмацыйна перанасычаную вясну. У структуры беларускага календара гэтай пераходнай пазіцыі адпавядала святкаванне Масленіцы. Калі ўлічыць, што адно з ключавых месцаў ва ўсім гэтым складаным рытуальна-абрадавым комплексе займала катанне на санках з горак (спецыяльна для гэтага зробленых), то найбольш дакладным часам колішняга правядзення свята трэба лічыць апошні тыдзень лютага і першы тыдзень сакавіка. Такая часавая суаднесенасць можа быць апраўданай у сувязі з тым, што, хутчэй за ўсё, Масленіца некалі адзначалася на працягу двух тыдняў. І тады першы святочны тыдзень сімвалізаваў заканчэнне зімы, а другі — пачатак каляндарнай вясны.

● Нельга выключаць і той версіі, што святы пераходна-прамежкавай прымеркаванасці маглі адзначацца ў адапаведнасці з больш складаным алгарытмам, які спалучаў у сабе дакладна фіксіраваную дату астранамічнага пачатку вясны — 1 сакавіка і першую маладзіковую фазу Месяца.

● З прыходам хрысціянства і актыўным пашырэннем у сферы сацыяльнага і культурнага жыцця грамадства святаў хрысціянскай Пасхаліі і ў сувязі з увядзеннем сямітыднёвага Вялікага посту, які папярэднічаў падзеям Вялікадня, святкаванне Масленіцы:

— павінна было скончыцца да пачатку посту;

— скарацілася з двух тыдняў да аднаго;

— набыло дадатковыя рысы ў змесце, сімволіцы і абрадавых падзеях.

● Масленіца стала абрадава-этычнай мяжой паміж штокольвечным сялянскім хлебасольствам і праваслаўным аскетызмам, які суправаджаўся не толькі значнымі абмежаваннямі ў ежы, але нават і поўным адмаўленнем ад яе.

Масленіца, Масленка, Масніца, а таксама і ў царкоўнай назве — «Сырная сядміца» — назва свята можа тлумачыцца і тым, што ў гэты час (канец лютага — пачатак сакавіка) адбываўся масавы акот і ацёл хатняй жывёлы. У кожнай гаспадарцы было багата малака і ўсялякіх малочных прадуктаў.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Жанчыны менш за ўсё размаўляюць у лютым, бо люты — самы кароткі месяц. Мужчыны ж робяць жанчынам падарункі на пачатку сакавіка.

У падзяку за люты.

☺

— Жанчына, у вас такі разумны, прыгожы і спартыўны муж!

— Гэта вы яшчэ майго палюбоўніка не бачылі!

☺

— Слухай, а ў цябе як машына — у мінус 25 заводзіцца?

— А хто яе ведае — яна не адчыняецца...

☺

Цешча і зяць:

— Дарагі зяцёк, у мяне для цябе ёсць дзве навіны: адна дрэнная, другая добрая.

— Мама, тое, што вы дагэтуль жывыя і здаровыя, я і так бачу — кажыце ўжо добрую навіну.

☺

Учора ў перадачы «Дабранач, малыя» ляльковод выпадкова стукнуўся галавой аб стол.

Такіх пажаданняў на ноч дзеці яшчэ не чулі.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 5 (337)

Агарод пачынаецца з падвакання

Для чаго вырошчваюць расаду агародных раслін? Правільна, каб атрымаць больш ранні ўраджай. Часцей за ўсё вырошчваюць праз расаду паслёнавыя, капусту белакачанную, сельдэрэй каранёвы, а таксама некаторыя іншыя культуры. Яшчэ не позна паклапаціцца пра тару, у якую будзеце высяваць насенне, падрыхтаваць глебу, набор угнаенняў, інструменты.

Глебавы субстрат можна купіць гатовы ў краме (цяпер гэта не праблема), а можна і самім прыгатаваць глебавую сумесь з торфу, дзярновай, лісцвой, перагнойнай глебы, садовага кампосту, буйназярністага пяску. Яго падбіраюць так, каб гатовая глеба была рыхлай, добра ўсмоктвала вільгаць, не перасыхала. Дадаўшы попел, мінеральныя ўгнаенні, можна павысіць урадлівасць падрыхтаванага грунту.

Вялікай папулярнасцю ў дачнікаў і гаспадароў прысядзібных гаспадарак карыстаюцца ячэістыя паддоны, а вось тарфяныя гаршочкі, як паказалі даследаванні, маюць некаторыя недахопы: яны хутка перасыхаюць і не раскладаюцца ў глебе, што моцна стрымлівае рост каранёвай сістэмы.

Капуста ранняя і не толькі

Працягласць расаднага перыяду ў хуткаспелых гатункаў капусты белакачаннай складае 45—55 дзён. Каб атрымаць раннюю прадукцыю, пажадана насенне на расаду высяваць у канцы лютага — пачатку сакавіка. У такім выпадку ўраджай можна атрымаць у ліпені — пачатку жніўня, тады ён будзе да месца, а ўжо пазней з'яўляюцца сярэднепозняя гатункі, якія пераўзыходзяць па якасці.

Капуста — холадаўстойлівая культура, якая не патрабуе загартоўвання насення. Яго высяваюць прама ў гаршочкі або ў скрынкі. Глыбіня заворвання насення 0,5-1 см. Пры пакаёвай тэмпературы ўсходы з'яўляюцца на 3—5-ы дзень. Як толькі з'яўляюцца першыя сапраўдныя лісцікі, расаду трэба пікіраваць у пластмасавыя слоікі. Расаду неабходна паліваць і па меры неабходнасці падкорліваць арганічнымі і мінеральнымі ўгнаеннямі. Аптымальная тэмпература для росту і развіцця расады капусты — 18—22 градусы. Калі тэмпература будзе вышэйшай, то гэта можа потым адбіцца на завязванні качаноў. Тыдні за два да высаджвання на пастаяннае месца расліны выносяць у халаднаватае месца з тэмпературай 10—12 градусаў. Выцягнутая кволая расада не дасць належнага ўраджаю.

Цыбуля з насення

Да сяўбы трэба праверыць усходжасць насення, пажадана каб гэта было насенне папярэдняга года, бо праз 3-4 гады яно дае адзінкавыя ўсходы. Перад сяўбой яго замочваюць пры пакаёвай тэмпературы і прарошваюць на працягу 3—5 дзён, пастаянна мяняючы ваду. У вадзе, тэмпература якой 40 градусаў, гэты працэс скарачаецца да васьмі гадзін. Выкарыстоўваюць невялікія ёмістасці, можна самаробныя, але лепш узяць пластыкавыя ячэістыя паддоны. У кожную ячэйку высяваюць па некалькі штук насення, каб пасля з'яўлення ўсходаў пакінуць 2-3 расліны. Пасля прараджвання або пікіроўкі адлегласць паміж раслінамі павінна быць не менш як 3-4 см. Расліны ўмерана паліваюць і падкормліваюць. Аптымальная тэмпература для росту і развіцця — 18—20 градусаў. Калі святла будзе мала, расада цыбулі будзе слабай і кволай. Расаду можна пікіраваць, а можна і не рабіць гэтага.

(Працяг тэмы ў наступным выпуску.)

Аксаміткі як прыправа

Аксаміткі (бархатцы), або тагецес, добра ведаюць кветкаводы-аматары. У нашай краіне гэтыя кветкі звычайна разводзяць як дэкаратыўныя. Насамрэч жа, гэта адна з самых універсальных па прымяненні культурных раслін. Многія агароднікі добра ведаюць, што аксаміткі высаджваюць таму, што глеба ачышчаецца ад нематод. Акрамя таго, садаводы выкарыстоўваюць іх надземную частку як эфектыўны інсектыцыд.

Цікава, што ў пасадках аксаміткі сярод агародных культур скарачаецца колькасць тлі і даўганосіка. Сярод градак суніц аксаміткі стрымліваюць развіццё грыбковых хваробаў. Для больш поўнага выкарыстання іх ахоўных уласцівасцяў увосень не выкідвайце ў кампост расліны, якія ўжо адцвілі, — лепш здрабніць іх і закапаць сярод градак.

Магчыма, мала хто з агароднікаў-аматараў ведае і аб яшчэ адным прымяненні аксаміткаў. У сімпатычных, але непатрабавальных кветачак ёсць уласцівасці, якія ставяць іх у адзін шэраг з каляндрай, імбірам, базілікам. Так, гэта далікатная прыправа, якая больш вядомая ў кухнях Закаўказзя, а таксама ў краінах Лацінскай Амерыкі і Заходняй Еўропы.

У прыродзе вялікае мноства аксамітак, але ў культуры распаўсюджана ўсяго некалькі: прамастаячыя, адхіленыя або раскідзістыя, рассечаныя, або танкалістыя і дробныя. Вышыня іх ад 15 да 210 см. Выведзены дэкаратыўныя гатункі з разнастайнымі па памеры, форме і колеры суквеццямі. І ўсе віды, формы і гатункі аксамітак аднолькава прыдатныя для прыправы, бо на смак яны вельмі падобныя. Для прамысловай нарыхтоўкі часцей вырошчваюць нізкарослыя формы дробных аксамітак, радзей танкалістыя. Выкарыстоўваюць як прыправу высушаныя і размолатыя кветкавыя кошыкі.

«Імерэцінскі шафран» — так часта называюць гэту прыправу ў некаторых кухнях, дадаюць у стравы з фасолі і іншай агародніны, асабліва ў тыя, у склад якіх уваходзяць грэцкія арэхі. Аксаміткі — абавязковы складнік вострых прыпраў для супоў, кладуць іх у стравы з птушкі, ялавічыны, свініны, крыху радзей ужываюць пры прыгатаванні рыбы. Аксаміткі ўваходзяць у склад большасці грузінскіх соусаў, у першую чаргу — арэхава-таматнага.

Як жа вырасціць аксаміткі, каб яны сталі не толькі ўпрыгажэннем участка, але і маглі быць выкарыстаны для нарыхтоўкі прыправы?

Садаводы-аматары могуць выкарыстоўваць любыя гатункі, якія вырошчваюць у дэкаратыўных мэтах. Аксаміткі цеплалюбівыя, асабліва адчувальныя да холаду ўсходы, нават пры станоўчых, але блізкіх да нуля тэмпературах, што можа паўплываць на далейшы рост і цвіценне. Калі насенне было сабрана спелым, то і ўсходжасць будзе дасягаць 90—95 працэнтаў. Пры тэмпературы 15—25 градусаў насенне прарастае на 4-ы дзень, глыбіня высявання 1,5—3 см. Першыя чатыры тыдні сеянцы растуць марудна, затым рост паскараецца. Яны любяць сонечныя мясціны, але растуць і ў паўцяні, толькі там менш шчодра цвітуць. Расаду высаджваюць тады, калі мінуе пагроза замаразкаў, альбо накрываюць на ноч плёнкай, нятканым матэрыялам. Перасадку лёгка пераносяць нават падчас цвіцення.

Да глебы расліна непатрабавальная, але любіць урадлівую. Праз тыдзень пасля высадкі падкормліваюць аміячнай салетрай. Хоць да засухі ўстойлівая, але добра рэагуе на паліў, і не любіць лішку вады. Добра пераносіць высокую тэмпературу паветра, далейшы догляд звычайны: рыхленне, праполка.

Цвітуць аксаміткі ўсё лета. Каб прадоўжыць цвіценне, кветкаводы звычайна зразаюць адцвіўшыя кошыкі. Пры нарыхтоўцы на прыправу: выбраныя загадзя расліны скошваюць у сярэдзіне ліпеня на вышыні 15 см. Пасля скошвання рыхляць паміж радамі, а расліны падкормліваюць зноў жа аміячнай салетрай і паліваюць. У выніку пачынаецца новае адрастанне парасткаў, і ў верасні можна збіраць другі ўраджай. Калі аксаміткі дробныя, то іх скошваюць на прыправу адзін раз у перыяд масавага цвіцення, у жніўні, на вышыні 30 см.

Насенне нарыхтоўваюць, калі яно паспее ў цэнтральных галоўках куста. Спазняцца з уборкай нельга — выспелае насенне лёгка высыпаецца на зямлю.

Дачніку ў нататнік

● Дабаўленне вадкага мыла да растворaў многіх ядахімікатаў узмацняе іх дзеянне.

● Здробненае шалупінне яек можна выкарыстоўваць як кальцыевае ўгнаенне на кіслых глебах.

● Настурка прадухіляе развіццё ўзбуджальніка фузарыёзу астраў.

● Агрэст не любіць серы, якая прымяняецца ў садзе супраць мучністай расы і кляшчоў. Калі на лісты трапляе молатая альбо калоідная сера, агрэст адразу ж скідвае ўсе лісты.

Мучністая раса «косіць», як каса

«Дайце параду, як змагацца з мучністай расой на цыбулі».

Н.В. Казленка, *Баранавіцкі раён.*

Цыбулю часцей за ўсё пашкоджвае лжывая мучністая раса, ці паранаспароз. На пёрах з'яўляюцца бледна-зялёныя авальныя плямы, колер якіх затым пераходзіць у шэра-фіялетавы, ліст жаўцее і засыхае, цыбуліна перастае расці. Заражаныя цыбулінкі-сеянкі не адрозніваюцца ад здаровых, таму што захворваюць яны праз 3-4 тыдні пасля пасадкі. Захворванню садзейнічаюць дажджлівае халаднаватае надвор'е, загушчаныя пасадкі, суседства са шматгадовай цыбуляй, — рэзервуарамі лжывай мучністай расы, а таксама суседства з агуркамі, якія таксама данімае гэта навала.

Каб не дапусціць захворвання, трэба праводзіць прафілактычныя апрацоўкі тыдні праз 2 пасля пасадкі, калі ўжо адрасце пер'е. Прымяняюцца прэпараты кантактнага дзеяння — тыя, якія змываюць медзь. Напрыклад аксіхом, ці медна-мыльная эмульсія (8-10 г меднага купарвасу і 2 сталовыя лыжкі пральнага парашку на 10 л вады). Расход прэпаратаў — 1 літр на 10 кв. м. Паўторная апрацоўка праводзіцца праз 2 тыдні.

Перад пасадкай на працягу сутак цыбуліны пратрымайце ў растворы попелу (2 жмені на вядро вады). Або, як раяць спрактыкаваныя агароднікі, у прыгатаваныя ямкі для цыбулі сыплюць жменьку попелу, затым паліваюць вадой, а за дзень да пасадкі цыбулю абразаюць па плечыкі, на шэсць гадзін замочваюць у ружовым растворы марганцоўкі. Затым яшчэ на пару гадзін — у любым стымулятары росту (эпіне, янтарнай кіслаце, гетэрауксіне).

Прафілактыка: закладваць на захоўванне добра выспелую і добра прасушаную цыбулю, аглядаць яе час ад часу і выкідваць хворыя цыбуліны.

Сад без хваробаў і шкоднікаў

Асаблівасцю вашага саду з'яўляецца тое, што на невялікіх участках размяшчаюцца пладовыя, ягадныя, агародныя і кветкавыя культуры. Многія вырошчваюць лекавыя, а таксама рэдкія экзатычныя расліны — усяго пакрысе. Каб у вашым садзе ўсім жылося камфортна, весела і дружна, кожнай расліне на ўчастку трэба выбраць месца, якое адпавядае яе прыродным патрабаванням да сонца, вады, глебы. Напрыклад, віноград, чарнаплодная рабіна, абляпіха, ружы і амаль усе агародныя культуры добра будуць расці толькі на сонцы, а вось парэчкі і агрэст любяць паўцень, каліна баіцца прамых сонечных прамянёў і вельмі любіць ваду. Многія гаспадары, прыбаўляючы на свой участак кожны год нават па адной расліне, забываюць, што, можа, камусьці ў агародзе цесна, і кожнай расліне патрэбна свая плошча. Такія дрэвы, як абрыкосы, чарэшні, вішні, якія ўтвараюць вялікія кроны, павінны высаджвацца адно ад другога не бліжэй, чым 5,5—6 м. У адваротным выпадку вырастаюць хілыя, тонкія галіны, якія перапляцаюцца адна з другой, і там не завяжацца добры ўраджай, ды і той з'ядуць шкоднікі. Хваробы, як правіла, пашкоджваюць тыя плады, якія растуць у загушчаных кронах, не прадзімаюцца ветрам і не асвятляюцца сонцам. Вялікую ролю ў здароўі саду адыгрывае рэгулярная і правільная абрэзка дрэў і амалоджванне кустарнікаў. Нельга ў адзін год абразаць шмат галін з дрэва. Гэта вядзе да ўтварэння ваўчковых парасткаў, якія ахвотна засяляе тля, мядзяніца, шчытоўка.

Вялікае значэнне на ўчастку мае ўрадлівасць глебы. Толькі моцныя, угнаеныя і дагледжаныя расліны бываюць здаровымі, іх не даймаюць хваробы і не нападаюць шматлікія шкоднікі. Самае даступнае ўгнаенне — гэта кампост, які некаторыя садаводы недаацэньваюць. У якасці ўгнаенняў у садзе можна выкарыстоўваць драўнінна-раслінны попел, у якім шмат пажыўных рэчываў, больш за ўсё калію. У попеле лісцёвых парод больш пажыўных рэчываў, чым ў попеле хвойных. Для раўнамернага размеркавання па паверхні яго змешваюць з сухой глебай або пяском у суадносінах 1:2. Трэба памятаць, што попел гіграскапічны, і таму захоўваць яго трэба ў сухіх памяшканнях у поліэтыленавых або шматслойных папяровых мяшках. У крамах прадаюцца комплексныя ўгнаенні і сумесі, комплексныя ўгнаенні з мікраэлементамі. На садовых участках лепш уносіць поўнае мінеральнае ўгнаенне.

Вельмі важным для здароўя саду з'яўляецца падбор гатункаў. Выбірайце тыя гатункі, устойлівыя тых ці іншых хвароб.

Не забывайце пра чаргаванне культур. На месцы, дзе раслі семачкавыя культуры (яблыні, грушы, айва і інш.), можна высаджваць толькі костачкавыя (слівы, вішні, абрыкосы), і наадварот.

Вялікую карысць саду і агароду прыносяць птушкі. Высаджвайце на ўчастку рабіну, каліну, іргу, бузіну, пладамі і ягадамі якіх птушкі харчуюцца ўвосень і зімой.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьм